

РАЗВІТАЦЦА З ЛІШНІМІ КІЛАГРАМАМІ

Сямейная газета

ЯК ЗНАЙСЦІ ПАДЫХОД ДА ДЗІЦЯЦІ-ПАДЛЕТКА?

Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 ЖНІЎНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 156 (29778)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Інфляцыя — гэта негатыўны фактар, які ўплывае на ўсё ў нашай краіне. Але большая частка гэтай інфляцыі — праблемы знешняга свету, таму што мы працягваем завозіць па імпарце сыравіну і тавары. Прынята праграма сумесных дзеянняў урада і Камітэта дзяржкантролю па стабілізацыі цэн, і там закладзены механізмы па дадатковым кантролі менавіта імпартных цэн, удасканалення сістэмы вытворчасці айчынных тавараў з пункту гледжання распрацоўкі мер па зніжэнні сабекошту і шэраг іншых пазіцый».*

## КОРАТКА

- **У Беларусі намалацілі 4 млн тон збожжа.**
- Інфляцыя ў Беларусі ў ліпені склала 0,5 працэнта.
- **Мінэканомікі: рэкордны прафіцыт знешняга гандлю абумоўлены значным скарачэннем імпарту.**
- Дзякуючы сацыяльнаму праекту «Дыхай» віцебская бальніца атрымала апарат ШВЛ.
- **Міністэрства аховы здароўя Беларусі змяніла парадак вакцынацыі супраць каранавіруса.**
- Урад вызначыў парадак прызнання дакументаў аб адукацыі, выдадзеных за мяжой.
- **Беларусы могуць анлайн праверыць знаходжанне аўтамабіля ў вышуку па VIN.**
- Іван Бахар прызнаны найлепшым гульцом 16-га тура чэмпіянату Беларусі, Алег Патоцкі — аўтарам найлепшага гола.


ISSN 1990 — 763X


# ХЛЕБНЫЯ КАНІКУЛЫ



Лічаныя дні засталіся да завяршэння ўборкі збожжавых у КСУП «Слабадское» Мазырскага раёна. Паводле слоў **галоўнага агранома гаспадаркі Віталя АСТАПЕНКІ,** уборачная сёлета прайшла паспяхова, і асабліва ўраджайнай стала сабраная на палях гаспадаркі пшаніца.

Вядома, у апошнія дні жніва асабліва шмат працы на мясцовым збожжатоку, дзе вяскоўцам незаменную дапамогу аказваюць навучэнцы школ, тэхнікумаў і ВНУ. Усе яны — восем чалавек — родам са Слабады. Некаторыя заканчваюць мясцовую школу, некаторыя вучацца ў БНТУ, як, напрыклад, Мікіта КАРА *(на фота)*, у гомельскім чыгуначным каледжы. Ды і за работу маладыя людзі змаглі атрымаць зарплаты, якія дазволяць ім аплаціць вучобу, купіць новае адзенне, дапамагчы бацькам.

**Фота Віктара ДРАЧОВА.**

Напярэдадні

## КНІГА ПРЫВЯДЗЕ Ў ДОБРУШ

**На Дні беларускага пісьменства прэзентуюць падборку выданняў на тэму «справядлівасць»**




СТАР. 3


Мемарыяльны комплекс «Памяць» у Добрушы.

Сезонны клопат

## «ПАДЧАС РАБОТЫ ДУМАЕШ ПРА ТОЕ, КАБ БОЛЬШ САБРАЦЬ»

**Як буякі заваёўваюць папулярнасць на палетках СВК «Прагрэс-Верцялішкі» Гродзенскага раёна**



**Яшчэ — 10-15 гадоў таму салодкія садовыя буякі можна было лічыць далікатэсам. Паколькі яны толькі ўваходзілі ў шырокі гандаль, іх кошт, адпаведна, быў даволі высокі. Куплялі ў асноўным невялікімі партыямі. Сёння прапаноў хапае. А справа ў тым, што ягады сталі выгадней культурай як для прыватных гаспадарак, так і сельскагаспадарчых кааператываў. На адной з самых вялікіх плантацый Гродзенскай вобласці пабывала і карэспандэнт «Звязды».**


СТАР. 13

Аб гэтым гаварылі ў Прэзідэнта

# «БЕЛАРУСЫ НЕ ПАВІННЫ НІЧОГА АДЧУЦЬ»

## Як эканоміка пераадольвае санкцыі

**У аўторак Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка фактычна сам правёў пасяджэнне Савета Міністраў, якое было прысвечана функцыянаванню эканомікі ва ўмовах санкцый і мерам па іх пераадоленні. Больш за тры гадзіны спецыялісты з розных бакоў разглядалі аспекты эканамічнай устойлівасці: імпартазамяшчэнне, нарошчванне экспарту, дзейнасць на знешніх рынках, выкананне сацыяльных абавязкаў перад насельніцтвам. Мы пацікавіліся ў спецыялістаў, якія прысутнічалі на Саўміне, як будуць вырашацца актуальныя эканамічныя праблемы.**

**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей БАГДАНАЎ** расказаў, як ідзе кантроль за цэнаўтварэннем на ўнутраным рынку. «У нас ёсць спецыяльная пастанова, якая рэгулюе спажывецкія тавары на ўнутраным рынку, іх цэнаўтварэнне. І там ёсць два механізмы: больш жорсткі і менш жорсткі, дзе мы на сацыяльна значныя групы тавараў устанаўліваем вельмі жорсткае цэнаўтварэнне, і павышаць яго можна на гэтыя групы тавараў толькі на 1,2 працэнта ў месяц. Па больш шырокай групе тавараў мы вызначылі для вытворцаў максімальна дапушчальны ўзровень рэнтабельнасці, а для пастаўшчыкоў, імпарцёраў і гандлю ў тым ліку максімальныя гандлёвыя аптовыя надбаўкі. І такім чынам тавары рэгулююцца. Гэта вельмі шырокі пералік тавараў. Сёння больш за 50 % тавараў у нашай краіне рэгулюецца і не дапускаецца лавінападобнага росту цэн», — расказаў Аляксей Багданаў. Міністр падкрэсліў, што інфляцыя — гэта негатыўны фактар, які ўплывае на ўсё ў нашай краіне. Але большая частка гэтай інфляцыі — праблемы знешняга свету, таму што ў краіну па-ранейшаму працягваюць завозіць па імпарце сыравіну і тавары. «Прынята праграма сумесных дзеянняў урада і Камітэта дзяржкантролю па стабілізацыі цэн, і там закладзены механізмы па дадатковым кантролі менавіта імпартных цэн, удасканалення сістэмы вытворчасці айчынных тавараў з пункту гледжання распрацоўкі мер па зніжэнні сабекошту і шэраг іншых пазіцый», — дапоўніў Аляксей Багданаў.

Пры гэтым міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю звярнуў увагу, што аб'ём рэалізацыі айчыннай прадукцыі ў гандлі складае 77 працэнтаў. Прычым большая частка ўласнай вытворчасці — 80—90 працэнтаў — харчовыя тавары. Па нехарчовых таварах крыху меншы працэнт, паколькі мы даволі шмат імпартуем складанай бытавой тэхнікі.

«Прэзідэнтам пастаўлена задача забяспечыць насельніцтва ў шырокім асартыменце прадукцыяй як айчыннай, так і імпартнай вытворчасці. Беларусы не павінны нічога адчуць. Такая задача стаіць, мы яе выконваем і трымаем на пастаянным кантролі, ствараючы ўмовы для імпартазамяшчэння, увозу імпартных тавараў, у тым ліку абнуленне мытных пошлін на тавары крытычнага імпарту. Таму гэта пытанне не менш важнае, як і нарошчванне экспарту», — падкрэсліў Аляксей Багданаў.

### Відаць становучая дынаміка

**Міністр прамысловасці Пётр ПАРХОМЧЫК** расказаў, што яго галіна практычна выканала ўсе даведзеныя паказчыкі па выніках работы за шэсць месяцаў. «І ўжо дакладна відаць, што становучая дынаміка росту аб'ёмаў вытворчасці, росту экспарту захоўваецца і па выніках сямі месяцаў. З упэўненасцю можна сказаць, што мы захаваем гэтыя тэмпы на ўзроўні дзевяці месяцаў», — сказаў міністр. Па яго словах, складанасці, вядома, ёсць, але гэта ўсё вырашальна. У пытаннях імпартазамяшчэння наладжваецца супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Так, па словах Пятра Пархомчыка, да канца года 9,7 тысячы машынакамплектаў паступіць з Кітая на «БЕЛДЖЫ». «Гэта міжнародная кампанія, у яе вялікія актывы знаходзяцца ў Еўропе, Амерыцы. Як ні дзіўна, але ў гэтым аўтамабілі вельмі шмат камплектуючых, якія пастаўляюцца з еўрапейскіх краін. Гэта значыць, міжнародная каапераця ў вытворчасці аўтамабіляў Geely мае месца. Таму, зразумела, ёсць пэўны націск еўрапейскіх краін, Амерыкі для таго, каб гэтыя камплектуючыя не пастаўляліся ў Расійскую Федэрацыю, Рэспубліку Беларусь. Вельмі шчыльна ішлі перагаворы, нават даводзілася падключаць Прэзідэнта для вырашэння гэтага пытання», — расказаў Пётр Пархомчык. Аднак, па яго словах, прадпрыемства не паспее выйсці на лічбы мінулага года. «Мы занадта шмат патрацілі часу для таго, каб знайсці спосабы і метады, якім чынам гэтыя машынакамплекты будуць пастаўлены ў Рэспубліку Беларусь. Але, пачынаючы з верасня, па 2500—2600 аўтамабіляў будзем выпускаць на «БЕЛДЖЫ», — запэўніў ён.

**Генеральны дырэктар ААТ «Нафтан» Андрэй СОЙКА** расказаў, што, нягледзячы на цяжкасці, звязаныя са знешнепалітычнымі праблемамі, прадпрыемства развіваецца. Яго прадукцыю адпраўляюць па ўсім свеце: гэта і Афрыка, і Азія, усе рэгіёны далёкай дугі. «Украінскі рынак для нас быў вельмі важны, асноўныя аб'ёмы прадукцыі сыходзілі туды. Сітуацыя прывяла да таго, што з сакавіка мы змушаныя былі зніжаць аб'ёмы рэалізацыі прадукцыі на экспарт. За другі квартал нам прыйшлося прыкласці намаганні, каб выбудаваць новыя лагістычныя ланцужкі паставак. З ліпеня мы атрымалі становучы вынік. Галоўнае, што пачалі зніжаць рэшткі гатовай прадукцыі, вяртаць назапашаныя замарожаныя абаротныя сродкі назад у абарот прадпрыемства. У першае паўгоддзе мы спрацавалі стратна, а зараз выходзім на прыбытковую работу. З улікам прыбытковай работы і зніжэння рэштак у нас з'явяцца перадумовы ў чацвёртым квартале пачынаць павелічэнне аб'ёмаў перапрацоўкі нафты, як гэта было даручана Прэзідэнтам», — расказаў Андрэй Сойка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Па сутнасці

# ЛЮБІМУЮ НЕ АДДАЮЦЬ!



**Самае галоўнае — звычайна самае незаўважнае. Світанак над Прыпяццю, васілёк у каласах, сонца над крыжамі сталічнай Нямігі, зубцамі Камянецкай вежы і Лідскага замка, павольныя хмары над ляснымі абшарамі Белавежжа, птушыны шчэбет у ваколіцы... Сцяг роднай краіны над дахамі цагляных веліканаў... А як мы ставімся да самааддананай апекі і ласкі бацькоў? Альбо да гоману дзятвы пад зялёнымі шатамі паркаў ці на яркіх дзіцячых пляцоўках? Самае галоўнае — заўжды яшчэ і сціплае, чакае, калі звернем на яго ўвагу.**

Нядаўна пачуў павучальную гісторыю. Нейкі небарака прадаў хату бабулі дзеля таго, каб купіць тур да заморскага берага. Уражанні засталіся, а хаты — сваёй, цёплай, роднай — няма. Ці не нагадвае тое гульбішча двухгадовай даўнасці? Ці не пазнаюць сябе ў гэтым фігуранце здзелкі з сумленнем некаторыя прадстаўнікі нашага грамадства, якіх ужо можна назваць былымі беларусамі?

Час вылечвае. Нават ад самага мяцежнага віруса. А цяпер давайце разам паразважаем: чаму тое было? Чаму дзявятага жніўня 2020-га, звычайны летні дзень, намагаліся ператварыць у жудасную бездань для нашай краіны і беларусаў? Пляцоўка для мяцяжу была закладзена даўно. Як у будаўніцтве — патрэбна была «падушка». Вось у аснове «пэрамэн» — духоўнаідэалагічны вакуум, які ўтварыўся пасля развалу ўсяго савецкага. Гэта быў не толькі палітычны лад і надзейна знітаваныя эканамічныя зносіны адной шостай часткі свету. Гэта была свая рэлігія. Яе пазбавілі людзей. Адабралі. Тым самым зняважылі пакаленні сапраўдных герояў. Тых пакаленняў, якія перамагалі і аднаўлялі, будавалі і адкрывалі...

Беларусам, вядома, пашанцавала. На Лукашэнку, які стаў самым маладым бацькам для цэлага народа. Пустыя паліцы крам, выбітыя шыбы заводаў і забойствы крымінальных аўтарытэтаў каля будынка МУС забылі хутка. Мы будавалі сваю Беларусь. Замест карцінкі галодных шахцёраў з каскамі каля Дома ўрада ў нашу рэчаіснасць увайшлі карцінкі выпускнікоў школ, шпацыруючых па ўжо дагледжаным праспекце Незалежнасці. Маладая краіна на маршы.

Не, былі маршы і на пагост, і чарнобыльскія маршы. Але яны нагадвалі хмары ў светлы летні дзень. Развейваліся. Яшчэ ў 1996-м нашы ўлады далі зразумець усім спонсарам вестэрнізацыі (гэта адгалінаванне глабалізацыі): свайго не аддадзім, абарыгенамі ва Усходнім партнёрстве не будзем. Беларусам, вядома ж, пашанцавала. На Лукашэнку. Іншым краінам — не.

Спрабаваць на свой тады яшчэ моцны зуб самы сквапны капіталіст і няўрымслівы каланізатар — дзядзька Сэм — Беларусь пачаў разам з Украінай. Але народны Прэзідэнт адразу агучыў суверэнныя прыярытэты. Хабарніцтву, прыхватызацыі, асабліва зямлі, і дамінаванню замежнага капіталу — бой. Людзі падтрымалі. Але за самастойную палітыку, за смелую падтрымку народа Югаславіі пад бомбамі натаўскай дэмакратыі, за глыбінныя выступленні з трыбуны ААН супраць гегемона Лукашэнку аб'явілі апошнім дыктарам Еўропы.

Дарэчы, нам гэта час ад часу нагадвалі. Але толькі ў электаральныя кампаніі. Не, не таму, што грошай у сорасаўскіх паплечнікаў не хапала. Яны ж іх друкуюць! А таму што пры ўсім гэтым багатым фінансаванні не маглі назбіраць шмат «свядомых». Апазіцыя ў палітычнай прасторы гуляла, дакладней, мухлявала дзвюма картамі. Вельмі старымі і аблезлымі. Імі заўжды яны — калабаранты — гулялі. Першая — моўная, нацыяналістычная. Яна прыводзіць да абстрэлаў дзіцячых садкоў і нават жывых людзей падчас пахавання забітых, што цяпер робіцца ў Данбасе. Усё пачыналася з моўнага пытання. Другая карта: Расія — вораг. Гэта самая любімая мантра заходніх інвестараў рэвалюцый. Менавіта на глебе нянавісці заўжды спрабавалі знішчыць непераможную цывілізацыю і Напалеон, і Гітлер. Цяпер тое ж самае.

Трэба было вырашаць пытанне з «беларускім балконам». Парадным дзвярыма «нах остэн». Да Украіны ключык падабралі. Да Беларусі — ніяк. Вырашылі ўламіцца без запрашэння. Дарэчы, менавіта пандэмія таксама паспрыяла таму, што грамадства «захварэла» на перамены. Ужо потым беларусы зразумеюць, што шлях па сцэнарыі Лукашэнкі насамрэч аказаўся самым правільным і найменш балючым. Потым беларусы зразумеюць, што менавіта імпартазамяшчэнне і развіццё сваіх кампетэнцый, камбайны па тэлевізары, сур'ёзныя нарады ў Палацы Незалежнасці — не карцінка прапаганды, а рэальнасць, што зберагла нас і нашу краіну. Потым беларусы зразумеюць, што эканамічная інтэграцыя з Расіяй, фарміраванне адзіных рынкаў і наогул зносіны паміж Мінскам і Масквой — гэта сапраўднае сяброўства. А Еўропа можа толькі так — заляцацца. І ў той жа час майстраваць пастку.

Ужо потым беларусы зразумеюць, што кветкі, белае адзенне і іранічныя лозунгі ды плакаты — брудныя метады маніпулявання грамадствам. А сапраўдныя прыгажуні — гэта беларускія хлопцы, якія не здрадзілі прысязе. Ужо потым беларусы зразумеюць і пра махлярства міжнародных фондаў ды арганізацый. Ужо потым беларусы ўбачаць, што такое сапраўдная жорсткасць. Бязмежная — у польскім прыгранічны да мігрантаў, і звярыная — неверагодных украінцаў-нацыяналістаў да свайго народа. Але гэта будзе потым. І будзе развеяна мана беларускай інфабучы.

А два гады таму былі самыя цяжкія выпрабаванні за ўсю гісторыю суверэннай краіны. Тэлеграм-атакі з Польшчы, Украіны і Літвы пад кіраўніцтвам амерыканскіх інструктараў. Натаўскія танкі каля граніцы і польскія сцягі ў Гродне. Агонія мяцяжу на начных вуліцах Мінска, Пінска, Брэста і Жлобіна.... Бачыце, як атрымліваецца: днём звычайныя беларусы ішлі на работу, а ўвечары «неверагодныя» — на вайну супраць сваёй жа будучыні.

Адстаялі. Дзякуючы каму, цяпер ведае кожны. Нават ворагі. Але калі б не было гэтага чалавека? Не было адданых Беларусі людзей у пагонах, за мікрафонамі, са сцягамі ў руках... Што было б тады ў скверы каля Купалаўскага? Падчас гітлераўскай акупацыі там вешалі смелых патрыётаў, каб напалохаць усіх астатніх. Напалохаць імкнуліся і ў 2020-м. Напалохаць і падмануць. І што казаць — некаторыя маўчалі і думалі, што так і трэба. Якая барацьба? Калі за жаданне атрымаць рукапацісканне ў тусоўцы сталічнага бамонду, за прагу да лайкаў людзі фатаграфаваліся з сімваламі, пад якімі знішчалі беларускі народ. А як бы паступілі тыя, хто горда называў сябе «неверагоднымі» і «элітай»? Хто, што вельмі сімвалічна, хацеў, пачаўшы ад падмосткаў Купалаўскага, ператварыць усю краіну ў «раскіданае гняздо».

Не, дзявятае жніўня не стала дваццаць другім чэрвеня. А Беларусь не стала Украінай. Таму ў адным з сімвалаў нашай Незалежнасці гучаць не мантры ад замежных сцэнарыстаў, а гучыць сваё пранікнёнае: «Любімую не аддаюць!»

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю СЛЮНЬКОВА Мікалая Мікітавіча, былога намесніка старшыні Дзяржаўнага планавага камітэта Савета Міністраў СССР, першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю Героя Сацыялістычнай Працы, вядомага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча СЛЮНЬКОВА Мікалая Мікітавіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

# КНІГА ПРЫВЯДЗЕ Ў ДОБРУШ

**Вось ужо дваццаць дзявяты раз на Беларусі пройдзе свята, якое зрабілася любімым многімі, — Дзень беларускага пісьменства. У першыя выхадныя верасня гасцей запросіць старажытны Добруш, радзіма народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна. А яшчэ горад мае непасрэднае дачыненне да ўсіх, хто мае справу са сшыткамі, нататнікамі і паперай. Бо менавіта тут працуе знакамітая папяровая фабрыка «Герой працы», заснаваная яшчэ ў 1870 годзе.**

На прэс-канферэнцыі ў прэс-цэнтры Дома прэсы распавялі, як адбываецца падрыхтоўка да свята і чым яно здзівіць гасцей.

Адметнасць пачынаецца ўжо з таго, што ў сёлетняй імпрэзы некалькі важных тэм: Год гістарычнай памяці, юбілеі класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча, а таксама гісторыка-культурная спадчына Добрушскага раёна.

— Задумак вельмі шмат, — распавёў **Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік міністра інфармацыі.** — Сярод іх адзначу міжнародны круглы стол «Вечныя каштоўнасці праз кнігі. У аснове справядлівасць». Дыспут будзе транслявацца анлайн. Яшчэ адзін праект звязан з нарадзіўся падчас нашага ўдзелу ў Кніжным салоне ў Пецярбургу, дзе працуюць над стварэннем спісу са ста кніг, рэкамендаваных для прачытання. Было вырашана скласці спіс з дванаццаці кніг паводле пэўнай духоўнай каштоўнасці. Гэтая каштоўнасць — справядлівасць.

На такую думку арганізатараў натхніла выказванне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі «Справядлівасць — гэта аснова таго, што я спрабую зрабіць». Сярод абраных кніг — «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча, «Блакадная кніга» Алеся Адамовіча і Аляксандра Граніна, «Авадзень» Ліліян Войніч, «Капітанская дачка» Аляксандра Пушкіна, «Ганна Карэніна» Льва Талстога, «Тарас Бульба» Мікалая Гогаля, «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы, «Сэрца на далоні» Івана Шамякіна, «Майстар і Маргарыта» Міхаіла Булгакава, «Злачынства і пакаранне» Фёдара Дастаеўскага, «Ціхі Дон» Міхаіла Шолахава, а таксама кніга нашага сучасніка, народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца «Вам заданне».

**Сяргей МУСІЕНКА, сябар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі,** дадаў, што дванаццаць кніг, аб'яднаных тэмай справядлівасці, будуць прадстаўлены не толькі ў папяровым выглядзе — падчас свята можна будзе спампаваць іх электронныя версіі, займець аўдыёварыянт. Коды для гэтага знойдуцца ва ўпакоўцы чаю «Кніжная паліца». Кожны пакецік — у стылізаванай кнізе з цытатай. Фітачай створаны з дапамогай Анатоля Грыгор'ева, які шмат гадоў працуе ў сельскай аптэцы ў Рубяжэвічах і лечыць травамі.

Цікавым будзе праект «Бацькаўшчына», у якім задзейнічаны прадукцыя Добрушскай папяровай фабрыкі і калекцыя вядомага філакартыста, краязнаўца, гісторыка Уладзіміра Ліхадзедава. Кожная старонка календара з беларускімі карцінамі мінулага можа «ажыць» і з дапамогай праграмы ператварыцца ў сучасны пейзаж.

Дарэчы, на прэс-канферэнцыі адкрылі яшчэ адну «фішку» свята — галоўная сцэна будзе аформлена паводле Добрушскай папяровай фабрыкі, пазнавальнай для кожнага месціча.

Ганаровы **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, народны пісьменнік Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ** падкрэсліў:

— Мы разглядаем гэтае свята як своеасаблівы экзамен для пісьменнікаў. Нездарма на ім адбываецца падвядзенне вынікаў конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія». Пісьменікаў на свяце будзе больш, чым калі, — 200 чалавек. Хочацца ўхваліць намаганні Гомельскай абласной арганізацыі СПБ — яны змаглі запрасіць 25 расійскіх творцаў, правядуць круглы стол пра ролю пісьменніка і кнігі ў грамадстве. А яшчэ абвясцілі конкурс на найлепшы верш і песню пра Добруш. Напісана звыш 50 вершаў, ёсць і песні, якія прагучаць падчас свята.

Але праграмны мерапрыемствы пачнуцца задоўга да адкрыцця свята. Ужо 23 жніўня адбудзецца фінал рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка». Відэаверсія будзе транслявацца 4 верасня ў Добрушы. У конкурсе ўзялі ўдзел 16 тысяч школьнікаў з усёй краіны, фіналістам жа стаў толькі адзін з тысячы.

31 жніўня пачнецца навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў». **Кіраўнік экспедыцыі Аляксандр ЛАПАТА-ЗАГОРСКІ** распавёў, што адбылося ўжо шэсць анонсных канферэнцый у тых месцах, дзе пройдзе экспедыцыя.

Зразумела, чынны ўдзел у свяце бяруць выдаўцы. **Дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК** нагадаў, што сёлета ў снежні часопісу «Полымя» спаўняецца 100 гадоў, таму на свяце ў Добрушы пачнецца акцыя «100 дзён да стагоддзя», прысвечаная гэтай падзеі. Выдавецтва таксама падрыхтавала выставу кніг Івана Шамякіна і выпусціла ў серыі «Беларусь літаратурная» кнігу «Лучнасць сэрцаў і дум», куды ўвайшлі творы не толькі літаратараў Добрушскага раёна, але і з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Прадстаўяць цікавыя кніжныя навінкі і іншыя беларускія дзяржаўныя выдавецтвы, напрыклад, кніга «Скрадзенае дзяцінства» выдавецтва «Народная асвета» сабрала расповеды дзяцей-сведкаў Вялікай Айчыннай вайны; выдавецтва «Беларусь» стварыла альбом пра Добрушскі край.

Моладзь павінна прываблíць арганізаваная пры падтрымцы Міністэрства адукацыі ваенна-гістарычная рэканструкцыя «Бai за Добруш 1943 года. Партызанское супраціўленне».

Канцэрт-адкрыццё ўпершыню пройдзе ўвечары ў суботу, што дасць магчымасць зрабіць яго максімальна відовішчным. Акцэнт будзе зроблены на паэтах-песенніках.

На заканчэнне прэс-канферэнцыі Ігар Бузоўскі папрасіў прысутных назваць тыя дарагія кожнаму беларусу каштоўнасці, якія гэтак жа, як справядлівасць, могуць стаць тэмай серыі кніг, рэкамендаваных да чытання. Сярод адказаў, што прагучалі, — працавітасць, мір, вера, сям'я, веды, чалавекалюбства, самабытнасць, любоў, прыстойнасць.

**Людміла ІВАНОВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Урад Японіі пайшоў у адстаўку

**Урад Японіі ў поўным складзе пайшоў у адстаўку, паведаміла агенцтва «Кіёда».**

Як чакаецца, у хуткім часе стане вядома аб новым складзе ўрада Японіі пад кіраўніцтвам прэм'ер-міністра Фуміё Кісіды.

Першапачаткова перастаноўкі чакаліся ў пачатку верасня, аднак Кісіда вырашыў правесці іх зараз у сувязі з намерам паскорыць прасоўванне эканамічнай канцэпцыі «новага капіталізму», неабходнасцю прыняцця мер з-за росту цэн на прадукты харчавання і паліва, а таксама дзеля таго, каб загадзя падрыхтавацца да сесіі парламента.

### Расія запытала пасяджэнне Савета Бяспекі ААН з-за нападаў на Запарожскую АЭС

**На фоне абстрэлаў Запарожскай АЭС украінскімі вайскоўцамі Расія запытала на 11 жніўня пасяджэнне Савета Бяспекі ААН, каб Украіна не магла «схаваць злачынствы ад шырокай грамадскасці».**

Прадстаўнік МЗС РФ Марыя Захарава раскрытыкавала ААН за блакіроўку місіі МАГАТЭ на станцыю, назваўшы гэтае рашэнне безадказным. Таксама сенатар Аляксей Пушкоў заявіў, што прэзідэнт ЗША Джо Байдэн можа спыніць абстрэлы атамнай станцыі з боку УСУ, проста патэлефанаваўшы ўкраінскаму калегу Уладзіміру Зяленскаму.

Раней генеральны дырэктар МАГАТЭ Рафаэль Гросі выказаў занепакоенасць з-за абстрэлу Запарожскай АЭС.

### Экс-кіраўнік Малдавіі Дадон спрагназаваў увосень калапс у дзяржкіраванні і сацыяльны выбух

**Былы прэзідэнт Малдавіі Ігар Дадон, які знаходзіцца пад хатнім арыштам, заявіў, што восенню адбудзецца калапс у дзяржаўным кіраванні і сацыяльны выбух з-за серыі палітычных і эканамічных правалаў цяперашніх празаходніх улад.**

«Ужо ўсім зразумела: сітуацыя з кожным днём пагаршаецца, лепш з гэтай уладай не будзе. Увосень ці ўзімку сітуацыя выбухне. Сама дзяржаўная сістэма не вытрымае з такім праўленнем. У іх ужо поўны хаос. Гэтая сістэма проста распадзецца. У нейкі момант, можа, нават увосень, яна не зможа функцыянаваць», — сказаў Дадон.

Экс-прэзідэнт лічыць, што пасля атрымання грамадзянамі першых плацежак за ацяпленне пачнуцца масавыя пратэсты.

«І тут будзе няважна, што нехта за Расію, а нехта за Еўропу. У раёнах, у Кішынёве, у сёлах з'явіцца палатачныя гарадкі. Калі ўжо заўтра з'явіцца такі гарадок у цэнтры Кішынёва, я вас запэўніваю, кішынёўцы будуць рыхтаваць для яго насельнікаў гарачыя вячэры! Для таго, каб яны пратэставалі супраць Маі Санду», — адзначыў палітык.

Раней Дадон заяўляў, што ўлады Малдавіі выбралі няправільны метад барацьбы з інфляцыяй, які прывядзе да фінансавых праблем для насельніцтва і прадпрымальнікаў.

Героі жніва

# 2000 ТОН У АСАБІСТЫМ ЗАЛІКУ

**З пачатку ўборачнай у Віцебскім раёне 36-гадоваму камбайнеру УП «Рудакова» Валянціну ЯШЧАНКУ спатрэбілася ўсяго шэсць дзён, каб узяць першую тысячную мяжу. Не прайшло нават тыдня з першага хлебнага рэкорду ў гэтым сезоне, а ўжо ўчора перадавіка віншавалі з дзвюма тысячамі тон. Валянцін Юр'евіч першым у вобласці паказаў такі высокі вынік у сваёй катэгорыі.**



За 12 хвілін ён па-майстэрску напаўняе 10-тонны бункер «Нью Холанда» — хіба дзіўна, што з такім узроўнем прадукцыйнасці працы камбайнер Яшчанка лідзіруе на Віцебшчыне? Канешне, усё залежыць ад ураджайнасці і культуры, якую ўбіраюць: напрыклад, некалькі дзён таму была пшаніца, яна сёлета надзвычай урадзіла на рудакоўскіх палях, а зараз механізатар ездзіць па жытнёвых залацістых хвалях, не зніжаючы высоканабранага тэмпу. Гэта ўжо 12-ы сезон ва ўборачным летапісе мужчыны, а ў «Рудакова» — шосты. Штогод ён станавіўся пераможцам раённага спаборніцтва на ўборцы збожжавых і зернебабовых культур, а ў гэтым годзе ўзяў новую вышыню — ужо абласнога маштабу. «Не буду хаваць — вельмі прыемна. Я задаволены сваімі магчымасцямі, пачэсна быць прыкладам для іншых працаўнікоў. Планую перайсці трохтысячную, а можа, і чатырохтысячную мяжу», — усміхаецца Валянцін Юр'евіч.

Сам аграрый з Шаркаўшчыны, у 2016 годзе пераехаў у Віцебскі раён, які стаў для яго не толькі другім домам, але і месцам прафесійнага ўзлёту. Спачатку гаспадарка выдзеліла сям'і дом у Ноўцы, а пасля Валянцін з жонкай і трыма дзеткамі пераехалі ў Тулава. Так, хлебароб — шматдзетны бацька, выхоўвае двух сыноў і дачушку. На ўсё хапае часу: і на асабістую гаспадарку, і на хатнюю ўтульнасць, і на працоўныя дасягненні. Ён адзіны з сям'і, хто знайшоў шчасце і прызванне ў сельскай гаспадарцы. Калісьці яшчэ дома пачынаў пісаць хлебаробчую біяграфію разам з братам-блізнюком, але потым іх прафесійныя інтарэсы разышліся. Яшчэ адзін брат Валянціна працуе ўрачом у Казахстане. Для сваіх дзяцей Валянцін Юр'евіч з'яўляецца прыкладам, малыя разам з татам радуюцца яго поспехам, але пакуль ісці па бацькавых слядах не спяшаюцца. А ён і не супраць, бо ўпэўнены, што кожны ў жыцці павінен знайсці занятак па душы, такі шмат гадоў таму знайшоў і сам.

Працоўны дзень пачынаецца а палове сёмай раніцы, і шчыруе на хлебнай ніве апантаны камбайнер, пакуль сонца не схаваецца за гарызонтам. Праўда, бываюць і дні, калі «Нью Холанд" пад кіраўніцтвам вопытнага механізатара плыве па залацістым полі нават у густых прыцемках: выкарыстоўвае Яшчанка кожную пагодлівую хвіліну, каб сабраць у бункер больш збожжа — дазваляе моцнае асвятленне камбайна. За штурвалам працуе адзін, ды і навошта прафесіяналу памочнікі? Ледзьве паспяваюць прымаць «гарачы ўраджай» МАЗы. Пашчыруе на сваіх участках — паедзе дапамагаць калегам на іншыя палі. «Калектыў у нас дружны і гатовы дапамагчы адзін аднаму. Таму і вынікі маем высокія», — тлумачыць Валянцін Юр'евіч.

Сакрэт добрага ўраджаю ў раёне, расказвае першы намеснік старшыні Віцебскага райвыканкама — начальнік упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Пётр Каранковіч, залежыць не толькі ад сонечнага надвор'я. Нягледзячы на тое, што ўборачная кампанія ў паўночным рэгіёне стартавала пазней, тысячы тон сабранага зерня — гэта вынік захавання тэхналогіі пры правядзенні вясенніх палявых работ: унеслі ўгнаенні, своечасова засеялі, правялі хімпрапалку, падкармілі. Столькі сіл укладзена ў зямлю недарэмна — у раёне ўбрана больш за 43 працэнты плошчаў, сярэдняя ўраджайнасць складае 45 цэнтнераў з гектара.

Камбайнер вывеў і сваю формулу поспеху: важна працаваць не толькі аддана, але і самому закласці аснову пад будучы ўраджай. Круглы год механізатар шчыруе на зямлі: і ўзворвае, і сее, і косіць. Так і атрымліваецца: што сам пасееў, тое і зжаў, і даволі багата.

Павіншаваць аграрыя з чарговым дасягненнем на працоўным месцы прыехалі старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль Ліневіч, прадстаўнікі райвыканкама на чале са старшынёй Генадзем Сабынічам, старшыні абласнога і раённага камітэта прафсаюза работнікаў АПК, работнікі раённага цэнтра культуры і творчасці. Па традыцыі віталі перадавіка звонкай песняй і караваем. Кіраўніцтва паўночнага рэгіёна падзякавала механізатару за сабраны хлеб, пажадаўшы сямейнага дабрабыту і здароўя, і ўручыла каштоўныя падарункі. Ад імя абласной галіновай прафсаюзнай арганізацыі Валянцін Яшчанка быў узнагароджаны дыпломамі пераможцы ўборачнага спаборніцтва і грашовымі прэміямі ў памеры 10 і 15 базавых велічынь.

Кароткі перапынак на маленькае свята ў полі — і зноў да залатой нівы, дзе шамацяць налітыя сонцам каласы. І плыве на хлебным полі камбайн, пакідаючы пасля сябе чыстыя пракосы, а Валянцін — новы радок у летапісе Віцебшчыны.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

# ПЯТЫ КУТ

## Як пачуваюць сябе ўкраінскія бежанцы за мяжой?

**Еўрапейскія краіны адна за адной закрываюцца для ўкраінскіх бежанцаў. Днямі чэшскія ўлады ўпершыню не выдалі ім ніводнай часовай візы. Такую інфармацыю абвясціла Міністэрства ўнутраных спраў гэтай краіны. Па колькасці ўкраінскіх бежанцаў на душу насельніцтва менавіта Чэхія, а не Польшча — лідар у Еўропе.**



У Германіі некаторыя муніцыпалітэты і нават цэлыя землі ўводзяць мараторый на прыём украінскіх бежанцаў з-за дэфіцыту месцаў і фінансавых праблем, паведаміла Suddeutsche Zeitung. Адзначаецца, што складанае становішча ў многіх рэгіёнах краіны. Так, у Брандэнбургу некалькі раёнаў заявілі, што сутыкнуліся з перанаселеннем і адразу закрыліся для мігрантаў, а ў Саксоніі ўлады паведамілі: ужо не хапае сродкаў для выплаты сацыяльных дапамог.

Літва вычарпала свае магчымасці па іх прыёме. Аб гэтым заявілі ў літоўскім міністэрстве працы і сацабароны, паведаміла ТАСС. Раней літоўскае аддзяленне Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа заявіла, што восенню Літва можа сутыкнуцца з новай хваляй украінскіх бежанцаў. Гэта звязана з тым, што ў некаторых рэгіёнах Украіны ацяпляльны сезон можа так і не пачацца. У выніку з надыходам халадоў украінцы зноў пачнуць перабірацца ў еўрапейскія краіны, у тым ліку ў Літву. Людзі, якія вымушаны пакінуць родныя мясціны, становяцца непажаданымі гасцямі на Захадзе, які раней дэкламаваў для іх распасцёртыя абдымкі. Як пачуваюць сябе цяпер украінскія бежанцы?

### БЯСПЛАТНЫ СЫР

Пасля пачатку расійскай ваеннай спецаперацыі на Захадзе паспяшаліся заявіць, што гатовы з распасцёртымі абдымкамі сустрэць бежанцаў з Украіны і прапанаваць ім найлепшыя ўмовы. Пры гэтым першапачаткова меркавалася, што размяшчаць іх будуць не толькі ў цэнтрах часовага знаходжання, але і ў прыватным жыллі, уладальнікам якога была абяцана кампенсацыя за прыём украінцаў. Праўда, нават тады ўлады ЗША і Вялікабрытаніі, якія гучней за іншых заяўлялі аб гасціннасці, на справе абставілі выдачу віз цэлым шэрагам цяжкавыканальных умоў. Брытанскі прэм'ер-міністр Борыс Джонсан і ўвогуле прыгразіў высылкай у Руанду тым украінцам, якія паспрабуюць нелегальна заехаць на востраў.

На нацыянальных узроўнях працягваецца паступовае згортванне праграм падтрымкі бежанцаў, прычым гэта датычыцца не толькі Еўропы, адзначае tass.ru. Па звестках выдання Asia Times, урад Аўстраліі, кіраўнік якога Энтані Альбанезэ падчас візіту ў Кіеў абяцаў падтрымліваць Украіну «столькі, колькі спатрэбіцца», раптоўна абвясціў, што з 14 ліпеня адмяняе выдачу ўкраінцам гуманітарных віз, якія дазвалялі ім жыць і жыць. Потым, праўда, вырашыла падоўжыць дзеянне праграмы, але толькі на два тыдні. З еўрапейскіх краін Польшча з 1 ліпеня перастала выплачваць кампенсацыі тым, хто прытуліў у сябе ўкраінцаў. Да восені завяршылася аналагічная праграма і ў Літве: зараз колькасць украінцаў, якія прыязджаюць у Літву і якія ад'язджаюць адтуль, практычна зраўнялася, а ў Польшчы назіраецца нават перавага на карысць ад'езду.

Варшава спачатку гарантавала месячныя выплаты ў памеры 1200 злотых ($258) на чалавека на працягу першых двух месяцаў, пасля іх працягнулі яшчэ на два месяцы, а з 1 ліпеня субсідыі адмянілі, адзначыла ўкраінская газета «Країна». «Мы перакананыя, што многія людзі ў Польшчы здольныя стаць самастойнымі і адаптавацца. Мы не можам бясконца пералічваць гэтыя сродкі ўсім», — так растлумачыў рашэнне намеснік міністра ўнутраных спраў Польшчы і ўрадавы ўпаўнаважаны па справах бежанцаў з Украіны Павел Шэфернакер. Таксама з пачатку ліпеня перастаў дзейнічаць бясплатны праезд для ўкраінцаў на польскай чыгунцы, а з чэрвеня трэба плаціць за білеты ў гарадскім грамадскім транспарце.

Тэарэтычна ўкраінцы могуць уладкавацца ў Польшчы на працу. Аднак умовы пакідаюць жадаць лепшага. «Грошы заканчваюцца, трэба ісці на працу, а з двухгадовым дзіцем гэта цяжка. Украінцам прапануюць у асноўным вакансіі, на якія самі палякі не ідуць за такія грошы: прыбіральшчыкі, пасудамыйкі, на склады, на збор ураджаю», — распавяла кіяўлянка Вольга Сытнік.

### ГОРШ, ЧЫМ У ТУРМЕ

Некаторыя жыхары краін Еўрасаюза, якія ў лютым і сакавіку так актыўна выказвалі салідарнасць з Украінай і прымалі бежанцаў у сябе дома, ужо напрыканцы вясны пачалі высяляць мігрантаў, практычна выстаўляючы іх на вуліцу. Іншыя «жаласлівыя» еўрапейцы клапатліва абяцалі працаўладкаваць




украінак, на справе арганізоўваючы гандаль людзьмі. Як распавёў у інтэрв'ю Spiegel нямецкі старшыня дабрачыннай Міжнароднай юрыдычнай місіі (IJM) Дзітмар Ролер, гэтыя абставіны крыміналітэт выкарыстоўвае ў сваіх мэтах. У Румыніі, Балгарыі і Малдавіі, па яго словах, дзейнічаюць крымінальныя структуры, арганізаваныя па сеткавым прынцыпе, якія спецыялізуюцца на гандлі людзьмі. Яны маюць часта сувязі на ўкраінскай тэрыторыі. Іх арсенал уздзеяння на сваіх ахвяр распасціраецца ад пагроз, насілля, пазбаўлення дакументаў да падключэння прафесійных спакусніцаў. Попыт на жанчын і дзяцей з Украіны, паводле ацэнкі Ролера, на еўрапейскім рынку сучаснага гандлю рабамі неймаверна ўзрос.

У цяжкім становішчы апынуліся ўкраінскія бежанцы ў Балгарыі. Іх перасялілі з гатэляў у «гета» для бежанцаў — вагончыкі з агульнымі выгодамі, а таксама паменшылі памер кампенсацый на харчаванне і пражыванне з 40 леваў ($20) да 15 леваў ($8) у дзень. Ва ўрадзе краіны ўпэўнены, што гэтых сродкаў павінна хапіць на аплату размяшчэння і трохразовага харчавання.

З 13 ліпеня прыпынілі прыём бежанцаў у Шатландыі, узяўшы на ўзбраенне прыклад Уэльса. Урад гэтай краіны пасля трох месяцаў прыёму абвясціў, што людзей няма куды сяліць. Пры гэтым частку тых, хто ўжо прыехаў у Шатландыю, размясцілі на караблі Victoria I эстонскай суднаходнай кампаніі. Як піша Telegraph, каюты, у якіх будуць жыць бежанцы, па памеры меншыя, чым турэмныя камеры ў Шатландыі. «Пакоі прызначаны для размяшчэння да чатырох чалавек, гэта значыць, пры поўнай загружанасці на аднаго чалавека будзе прыходзіцца 21 квадратны фут (каля двух квадратных метраў). У той час як па правілах у агульных камерах у турмах Шатландыі на кожнага зняволенага павінна прыходзіцца не менш за 48 квадратных футаў (4,4 квадратнага метра)», — піша выданне, іранізуючы над абяцаным «цёплым прыёмам».

У Бельгіі ва ўкраінскіх бежанцаў таксама цяжкасці з паселішчам. Многія ўладальнікі кватэр просяць украінцаў пакінуць дамы на час іх летняга водпуску. Няпроста ўкраінцам арандаваць жыллё за грошы. Арэндадаўцы не жадаюць здаваць кватэры ўкраінцам, паколькі іх статус часовай абароны заканчваецца ў сакавіку наступнага года. А ў Бельгіі здаюць звычайна на даўжэйшы тэрмін — ад трох гадоў.

### ПЯКЕЛЬНАЯ ПРАЦА

У Італіі некаторыя ўкраінцы сталі заўважаць не надта ветлівае стаўленне сярод часткі жыхароў. «Ядаўно заўважыла, што ў Італіі мала хто разумее і спачувае ўкраінцам, нашы страхі, стрэсы, жудасныя гісторыі нікому не цікавыя; стаўленне сярод месцічаў да нас у большасці (выключэнне ёсць, але няшмат) як да недатурыстаў, дзе няма дыяспары, падтрымкі, некамфортна псіхалагічна», — напісала на сваёй старонцы ў Facebook журналістка і блогер Нэлі Вернер, якая жыве цяпер у Італіі.

Па словах бежанцаў, першыя тры месяцы ўсё было добра, ім давалі бясплатнае жыллё і дапамогі ў памеры 300 еўра на дарослага і 150 на дзіця. «Але выплат ужо няма, гаспадары намякаюць, што час ужо і з'ехаць. З працай тут зусім дрэнна. Уладкаваліся збіраць чарэшню па шасці еўра за гадзіну. Праца пякельная: па дзесяць гадзін у дзень і з адным выхадным у месяц. Таму надоўга нас не хапіла», — распавяла газеце «Країна» адна з апытаных украінак. Яшчэ адна суразмоўца выдання адзначыла, што ў Еўропе вельмі шмат неафіцыйнай занятасці, таму працаўнікі могуць падмануць і не заплаціць. Часам даводзіцца плаціць пасрэдніку каля 500 еўра, каб ён парэкамендаваў цябе на працу, дадала яна.

Не надта ветлівы прыём і ў Вялікабрытаніі, піша Politico. Першапачаткова краіна абяцала прыняць сотні тысяч мігрантаў, аднак пасля выдала значна менш віз — у асноўным тым украінцам, у якіх у краіне жывуць блізкія сваякі. Астатнія павінны былі знайсці «фундатара», які іх часова прытуліць. Пры гэтым усё часцей з'яўляюцца паведамленні, як брытанцы высяляюць украінцаў з-за непаразуменняў і канфліктаў. «Міграцыйны крызіс паказаў негатоўнасць Лондана да падобнай сітуацыі», — піша Politico.

Дзве трацыны галандцаў жадаюць, каб урад спыніў прыём просьбітаў прытулку. Пра гэта паведаміў партал навін NITimes са спасылкай на маштабнае апытанне праграмы навін EenVandaag. З прыкладна 28 тысяч рэспандэнтаў 78 працэнтаў занепакоеныя крызісам прыёму бежанцаў, які развіваецца ў Нідэрландах. Апытанне, апублікаванае на вэб-сайце EenVandaag, сведчыць аб тым, што многія галандцы лічаць несправядлівым, калі бежанцы маюць прыярытэтны доступ да сацыяльнага жылля.

Для многіх выхадцаў з Украіны неўзабаве заканчваецца тэрмін знаходжання ў краінах Еўрасаюза, пасля якога чалавек прызнаецца падатковым рэзідэнтам. Гэта азначае, што ўкраінцам хутка трэба будзе плаціць падаткі з любога даходу, у тым ліку грашовых пераводаў ад сваякоў або сацвыплат, піша Baltnews.

Пасля пачатку канфлікту ва Украіне мільёны ўкраінцаў адправіліся ў Еўропу. Нехта ратаваўся ад баявых дзеянняў, але многія грамадзяне Украіны, асабліва з заходніх абласцей, успрынялі гэта як магчымасць нарэшце пераехаць у ЕС. Амаль праз паўгода аказалася, што дапамога краін Захаду не бязмежная. Вечна спансіраваць украінцаў ніхто не збіраецца. Больш за тое, неўзабаве грамадзянам усходнееўрапейскай краіны давядзецца плаціць падаткі, як і ўсім рэзідэнтам, прычым незалежна ад таго, удалося ім працаўладкавацца ў ЕС ці не.

### АСТРАВОК ЛЮДСКАСЦІ

У Беларусь з лютага прыбылі каля 45 тысяч украінскіх грамадзян, паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце. Звыш 27 тысяч з іх праехалі ў нашу краіну транзітам праз краіны ЕС. Украінцы прыбываюць да нас у асноўным з Польшчы, а таксама з Літвы і Латвіі. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 22 ліпеня падпісаў указ аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь 471 чалавека, у тым ліку 114 непаўналетніх. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Грамадзянства дадзена 463 грамадзянам Украіны. Сярод новых грамадзян Беларусі — 33 сям'і з дзецьмі, сем — шматдзетныя. Адна з іх выхоўвае шасцярых непаўналетніх дзяцей, двое з якіх нарадзіліся ў Беларусі. Беларускія пашпарты атрымалі таксама двое вучоных — кандыдат эканамічных навук і кандыдат біялагічных навук. Пры гэтым аднаму з іх вучоная ступень прысвоена ў Беларусі.

Усяго пасля даручэння аб атрыманні грамадзянства, дадзенага Прэзідэнтам Беларусі ў жніўні мінулага года, беларускімі грамадзянамі сталі 4228 украінцаў. З іх па рашэнні кіраўніка дзяржавы грамадзянства Рэспублікі Беларусь дадзена 2247 украінцам.

Сёлета ў першым паўгоддзі ў Беларусі ў розных эканамічных сферах працаўладкавана больш як паўтысячы бежанцаў з Украіны. Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення знешняй працоўнай міграцыі, бежанцаў і прытулку Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Уладзімір Маргевіч, перадала БелТА. Ён дадаў, што ўкраінцы працаўладкаваліся ў сельскагаспадарчай сферы, дзіцячых садках, школах, на прамысловых прадпрыемствах. «Бежанцы атрымалі жыллё як у абласных, так і ў раённых цэнтрах. Для гэтай мэты, апроч іншага, былі задзейнічаны гасцініцы, дамы адпачынку, санаторныя комплексы», — адзначыў Уладзімір Маргевіч.

Як кажуць, адчуйце розніцу. Ёсць звесткі, што частка людзей, якія ад'язджаюць з Еўрасаюза, вырашаюць не вяртацца ва Украіну, а асесці ў Беларусі, адзначыў tass.ru. 80 працэнтаў бежанцаў, паводле анкетавання, хацелі б застацца тут назусім. Наша краіна, мабыць, ужо насамрэч лепш падыходзіць на ролю ціхай гавані, дзе да бежанцаў ставяцца па-людску, а не вымушаюць шукаць пяты кут. У Беларусі захавалі ўсё лепшае, што было некалі ў Савецкім Саюзе. Такім меркаваннем з БелТА падзяліўся шматдзетны бацька з Адэскай вобласці Дзмітрый Баравікоў, які зараз жыве і працуе ў Беларусі.

Дзмітрый з жонкай Вольгай выхоўваюць шасцярых дзяцей. Двое з іх у сям'і Баравіковых з'явіліся ўжо ў Беларусі. «Ва Украіне нікога з маіх дзяцей бясплатна не адпраўлялі ў санаторыі. Усё гэта там было праплачана практычна на любым узроўні. Такіх сацыяльных выгод, як у Беларусі, ва Украіне ў нас ці нашых дзяцей не было», — заўважыў Дзмітрый Баравікоў. Цяпер бацька шматдзетнага сямейства працуе жывёлаводам у Ельску. «У маім светаўспрыманні Беларусь — астравок старога добрага Савецкага Саюза. Па гэтай прычыне мы сюды і пераехалі, — падкрэсліў Дзмітрый. — Беларускі ўрад захоўвае ўсё тое найлепшае, што было ў Савецкім Саюзе, — адукацыю, медыцыну».

**Пётр ДУНЬКО.**

Сямейная газета
Выпуск № 13 (195)

## ЛЮБІЦЬ СЯБЕ

*«Любі сябе. Быццам ад гэтага залежыць тваё жыццё». Так называецца томік з серыі «Кнігі, якія трэба прачытаць да 35 гадоў». Я ўжо не паспела. Але, як той казаў, «найлепшы час, каб пасадзіць дрэва, быў 20 гадоў таму. Наступны падыходзячы момант — сёння», тым больш прадмова аўтара мяне ўжо заінтрыгавала. «Вы не прыходзіце ў спартзалу адзін раз, каб са спакойнай душой прызнаць: справа зробленая. Тое ж самае і з навучаннем любові да самога сябе. Ісціна ў тым, каб укладваць у любоў да сябе столькі ж сіл, колькі б вы ўклалі, падцягваючыся на руках, каб ускарабкацца на скалу. Як быццам ад гэтага залежыць ваша жыццё. Пачаўшы аднойчы, гэта няцяжка працягваць рабіць. Проста трэба ўзяць на сябе абавязак — і я пакажу, як зрабіў гэта я. Любоў змяніла ўсё маё жыццё. Я ведаю, што яна станеператварэннем і для вас».*

*На днях, убачыўшы, што муж выбірае з міскі для садавіны самыя прыгожыя яблыкі, а крыху падгнілыя так і працягваюць там ляжаць, на аўтамаце сказала: «Ты б спачатку разабраўся з горшымі...» У тое ж імгненне мы разам рассмяяліся, бо якраз напярэдадні я яму распавядала пра маці сваёй прыяцелькі, якая, маючы цэлы парнік памідораў, усё жыццё есць сапсаваныя. І прытчу з гэтай нагоды. Пашанцавала аднойчы кабеце — купіла цэлы мяшок яблыкаў за паўцаны. Прыйшла дадому, глядзіць: а там адна папяроўка крыху падгнілая аказалася. «Ну, — думае, — я яе сёння з'ем, а заўтра пакаштую свежанькую». Але на раніцу глянула ў мяшок і ўбачыла, што яшчэ адзін яблык пацямнеў. Прымяніла тую ж схему — з'ела яго, папярэдне абрэзаўшы падгнілае месца, а здаровыя плады на заўтра прыберагла. У выніку цэлы месяц харчавалася гнілымі яблыкамі.*

*Ды што далёка хадзіць, мая мама такая ж. Колькі сябе памятаю, усё найлепшае ў нас складалася ў секцыю, што стаіць у зале. Там, за шклом, і дагэтуль на пачэсным месцы стаяць зусім новенькія сервізы, якім па 20—30 гадоў. А калі нарадзіўся мой сын, мама дастала з секцыі кардонку з новенькімі распашонкамі і паўзункамі. Гэтую каробку з надпісам «Для нованароджанага» ім з татам падарылі на мае хрэсьбіны. Але яна так і засталася ляжаць у секцыі да лепшых часоў. Мама берагла адзенне для сваіх унукаў. Я не змагла не ўзяць тыя рэчы, але Сымонка так іх ні разу і не надзеў. Захоўваю больш як рэліквію, думаю, можа, перашыю штосьці, бо там вельмі якасная і прыемная на дотык фланель. Справа ў тым, што цяпер, дзякуй богу, няма дэфіцыту з дзіцячым адзеннем. І, як ні круці, сучасныя кофтачкі і штонікі больш зручныя і практычныя, чым савецкія паўзункі і распашонкі. Маму можна зразумець, яна рана засталася без бацькоў, ёй усё ў жыцці цяжка даставалася. Не раз казала, што ёй хацелася, каб у яе дзяцей і ўнукаў было па-іншаму.*

*Мне, дарэчы, таксама часткова перадалася маміна ашчаднасць. Набор посуду, які падарыла сястра, я дастала з каробкі толькі праз пяць гадоў пасля вяселля. Цяпер шкадую, што не зрабіла тое раней. Есці штодня з прыгожага посуду так прыемна!*

*Надоечы перабірала шуфляду з рознымі паперкамі і знайшла даўняе віншаванне ад сястры. Там былі такія радкі: «Паліце свечкі, ешце з прыгожага посуду, насіце прыгожую ніжнюю бялізну. Нічога не пакідайце для асаблівага выпадку. Асаблівы выпадак — ЦЯПЕР».*

*Нядаўна свякроў перадала нам тры галоўкі капусты. Мы паспелі з'есці толькі першую, як яна прывезла яшчэ адну. Я спачатку хацела нашаткаваць на сняданак тую, што праляжала ўжо больш як тыдзень. Але пасля згадала віншаванне сястры і зрабіла салату з самага свежага качана.*

*«Калі я пачаў любіць сябе, я вызваліўся ад усяго, што прыносіць шкоду майму здароўю — ежы, людзей, рэчаў, сітуацый. Усяго, што цягнула мяне ўніз і адводзіла прэч ад сябе. Спачатку я назваў гэта пазіцыяй здаровага эгаізму. Сёння я называю гэта «любоў да самога сябе», — казаў Чарльз Чаплін падчас прамовы на ўласнае 70-годдзе.*

*Ёсць выдатнае практыкаванне, з якога можна пачаць прывіваць любоў да сябе. Вазьміце чысты аркуш і напішыце, што для вас значыць «любіць сябе». Гэта могуць быць самыя простыя рэчы. Напрыклад, «нарэшце папіць кавы ў цішыні», «дазволіць сабе ўзяць адпачынак ад работы, які не брала апошнія дзесяць гадоў», «увесці за правіла мазаць твар і рукі крэмам перад сном». І проста тут і цяпер, не адкладваючы, выканайце самы просты пункт з вашага спіса. І так штодзень. Я пачала. Далучайцеся. Бо, як казаў Эрых Фром, любоў да іншага чалавека пачынаецца з любові да сябе.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Тыя, хто побач

Любоў ЧАРКАШЫНА:

# «Больш, чым з мужам, мне пашанцавала з бацькам маіх дзяцей»



**Маладыя сучасныя бацькі, дачушка Вера і сынок Данііл, два сабакі Чупа і Шаня. На першы погляд, абсалютна звычайная сям'я. Але гэта не зусім так. Праз два тыдні пасля нараджэння дзіцяці мама паехала на міжнародную канферэнцыю. Яна не брала дэкрэтны водпуск і разам з немаўляткам можа займацца любімай справай. А тата лёгка клапоціцца пра малое дзіця, даглядае яго. Усёй сям'ёй яны могуць выйсці на свецкае мерапрыемства або пакінуць дзяцей на бабуль і дзядуль ды правесці час удваіх. І самае галоўнае — ад такога ладу жыцця добра ўсім — і дзецям, і дарослым.**

**Нават у наш прагрэсіўны час лічыцца нормай, што маладая маці як мінімум першыя тры гады жыцця дзіцяці павінна закрыцца ад усяго свету і прысвячаць час толькі сям'і. А бацька мусіць зарабляць грошы і час ад часу гушкаць малое на руках. Аднак сёння такія ўяўленні аб сямейным жыцці — не больш як стэрэатып. Можна будаваць шчаслівую сям'ю і з іншымі падыходамі. Як прыклад — сям'я бронзавага прызёра Алімпійскіх гульняў 2012 года па мастацкай гімнастыцы Любові Чаркашынай і футбаліста Віктара Малашкі. Пара выхоўвае чатырохгадовую Веру і паўтарагадовага Данііла. Як у іх гэта атрымліваецца, Любоў Чаркашына расказала «Сямейнай газеце». А яшчэ гэта першае інтэрв'ю знакамітай #малышкаотмолашки (з такім хэштэгам Любоў дзеліцца фатаграфіямі дачкі ў сацыяльных сетках) — Веры Малашкі.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Правы сямейныя

# ДАЧЦЭ — КВАТЭРУ, СЫНУ — АЎТАМАБІЛЬ! А КАТУ?

## Навошта складаць завяшчанне і што ў ім можна, а што нельга ўказваць



**Каму можна пакінуць спадчыну? Што такое закрытае завяшчанне? Калі патрэбны сведкі, каб скласці гэты дакумент? Колькі разоў можна перапісваць завяшчанне? Хто мае права прэтэндаваць на спадчыну? Ці абавязкова спадчыннікам выконваць умовы завяшчання? Што будзе, калі адным з нашчадкаў замоўчваецца наяўнасць іншых спадчыннікаў? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнту «Звязды» дапамагла знайсці Надзея ШУПЕНЬКА, натарыус Мінскай абласной натарыяльнай акругі.**

### Чарга на спадчыну і права прадстаўлення

Скласці завяшчанне можа любы дзеяздольны чалавек, якому споўнілася 18 гадоў. Спадкаемцамі могуць быць людзі, жывыя на момант адкрыцця спадчыны, а таксама зачатыя пры жыцці спадчынадаўца і народжаныя жывымі пасля яго смерці.

— Напрыклад, у цяжарнай жанчыны памірае муж. Хоць іх дзіця яшчэ не нарадзілася, яно лічыцца спадчыннікам. І нават калі прайшло больш за паўгода пасля адкрыцця спадчыны, яно атрымае сваю долю пасля нараджэння, — удакладніла натарыус.

Спадчыннікі першай чаргі — муж, жонка, бацька, маці, дзеці памерлага. Унукі могуць успадкаваць спадчыну толькі па праве прадстаўлення — калі іх бацькі памерлі раней за бабулю і дзядулю.

— Калі бацька чалавека памёр раней за яго дзядулю, то ўнук можа атрымаць долю спадчыны, якая павінна была б адысці яго тату, — удакладніла Надзея Шупенька.

Да другой чаргі спадчыннікаў належаць паўнародныя ці непаўнародныя браты і сёстры памерлага. У гэтай чарзе дзеці братоў і сясцёр (пляменнікі памерлага) таксама могуць наследаваць спадчыну па праве прадстаўлення — калі іх бацькі памерлі раней за цётку ці дзядзьку.

Бабуля і дзядуля (з боку бацькі ці маці) памерлага ўваходзяць у трэцюю чаргу.

Чацвёртая чарга — паўнародныя і непаўнародныя браты і сёстры бацькоў спадчынадаўцы (цёткі і дзядзькі).

### З умовамі — нельга, з пажаданнямі — можна

Наследаваць маёмасць памерлага па законе могуць толькі яго сужэнец або сваякі па крыві. Аднак праз завяшчанне спадчынадавец можа перадаць сваю маёмасць не толькі любому чалавеку, але нават наогул Беларусі ці нейкай адміністрацыйнай адзінцы.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

# Крылы матылька,

## або Як перажыць пераходны ўзрост і не страціць кантакт са сваім дзіцем

**«Наш 14-гадовы сын з пухнатага коціка ператварыўся ў калючага вожыка. Пастаянна агрызаецца, кідае фразачкі накшталт «Адчапіся ад мяне, ты нічога не разумееш», — скардзяцца бацькі. Гэта нармальна, — сцвярджаюць псіхолагі. Як правіла, такія паводзіны звязаныя з сепарацыяй, спробай аддзяліцца ад сям'і, каб знайсці сябе ў гэтым жыцці. Натуральна, што ў падлетка (а сёння падлеткавы ўзрост расцягнуты ад 10 да 24 гадоў) з'яўляецца патрэбнасць больш часу бавіць са сваімі аднагодкамі, таму ў гэты перыяд прывязанасць да бацькоў змяншаецца. Калі мама і тата гатовыя да такога павароту падзей і разумеюць, што дзецям значна цяжэй, чым ім, то крызіс пубертату пройдзе не так балюча. Ніжэй вы знойдзеце канкрэтныя парады ад сямейнага псіхолага Таццяны ШАРАНДЫ. Пакуль здымала нашу гутарку з дыктафона, некалькі разоў на вочы наварочваліся слёзы, настолькі агучаныя ёю простыя ісціны глыбокія і важныя. Іх, як для мяне, варта прачытаць не толькі бацькам падлеткаў, але ўсім, хто мае альбо збіраецца мець дзяцей.**

### Пра эмацыянальныя арэлі ды розгу на кручку

**Да пераходнага ўзросту трэба рыхтавацца загадзя. Але не дзецям, а іх бацькам.** Бо выхаванне — гэта нялёгкая праца, у першую чаргу над сабой. Калі бацькі добра папрацавалі першыя дзесяць гадоў жыцця дзіцяці, то ім будзе значна лягчэй перажыць крызіс пераходнага ўзросту. Страшна, калі адчыняюцца дзверы і раз'юшаная мама штурхае ў кабінет псіхолага 14-гадовага сына са словамі: «Зрабіце з ім што-небудзь! Скажыце, колькі сеансаў трэба, каб яго выправіць». А што я магу зрабіць? 14 гадоў — не дзён, не месяцаў — яна «ляпіла» тое, што атрымала ў выніку... Колькі сеансаў? Ды ёй трэба не адзін год працаваць, каб вярнуцца хоць бы на крок назад.

**Самы вялікі пратэст у мяне выклікае педагагічная неадукаванасць бацькоў.** Сёння столькі даступных крыніц інфармацыі, здаецца, чытай, вывучай, унікай. Тады да падлеткавага ўзросту бацькі прыйдуць на дзесяць крокаў больш адукаванымі, чым любы псіхолаг. Я была ў шоку, калі даведалася, што ў XXI стагоддзі ў маладых бацькоў у прыхожай на кручку вісіць розга. Яны так выхоўваюць двухгадовае дзіця. А потым прыходзіць мама і скардзіцца: «Не закончыў дзявяты клас. Сабраў свае рэчы і паехаў, як высветлілася пазней, да таты ў Расію. Праз нейкі час патэлефанаваў адтуль і сказаў «я не вярнуся». Навошта да гэтага даводзіць? Б'еш дзіця (прычым псіхаэмацыянальны гвалт практычна нічым не адрозніваецца ад фізічнага) — чакай сур'ёзны адкат у падлеткавым узросце.

**Псіхіка падлетка — эмацыянальныя арэлі, якія разгойдваюцца ад любога подыху.** Уяўляеце, што адбываецца, калі побач з дзіцем знаходзіцца трывожная мама, якая ўвесь час паўтарае: «Не паступіш, пойдзеш у армію», «Не паступіш, будзеш дворнікам». Навошта вы гайдаеце гэтыя арэлі? Яму і так страшна. Адзін падлетак, якога мама прывяла да мяне на дыягностыку, прызнаўся: «Нават ад адной думкі, што мне трэба здаваць тэсціраванне, забываю ўсё, што вучыў». Не накручвайце сябе, бо тым самым вы транслюеце дзіцяці свой страх, трывогу.

**Падлеткавы ўзрост — гэта крылы матылька.** Возьмешся груба — ён не паляціць. Задача бацькоў — стварыць пляцоўку, з якой матылёк зможа ўзляцець. А што ж робіць мама? Заціскае і кажа — ляці. Ён загіне, гэты матылёк...

**Уявіце, што да вас на пару гадзін прывёў сваё дзіця вельмі важны для вас чалавек.** Як вы будзеце сябе паводзіць? Паспрабуйце так паводзіць сябе са сваім дзіцем. Паверце, вы будзеце ўражаныя, як усё пачне мяняцца.

### Пра тэхнікі «сэндвіча» ды «я-паведамленне»

**Раю ўсім бацькам асвоіць дзейсную тэхніку «я-паведамленне».** Замест таго, каб абвінавачваць дзіця, сказаўшы «Ты пастаянна не выконваеш мае просьбы!», падзяліцеся сваімі адчуваннямі: «Калі даводзіцца доўга прасіць, я засмучаюся, бо складваецца ўражанне, што мы чужыя. Я была б рада разлічваць на тваю дапамогу». Замест «Не хамі мне больш!» скажыце: «Калі я чую грубасці ў свой адрас, у мяне наогул знікае жаданне кантактаваць і хочацца сысці. Слухай, калі б ты ведаў, як мне балюча і крыўдна...». Пры гэтым не трэба адразу чакаць зваротнай сувязі.

**Часта падлеткі кідаюць крыўдныя фразы ў адрас сваіх бацькоў: «Ненавіджу цябе».** Як рэагаваць? А ніяк. Калі дачка нахаміла, будзь мудрэйшай, развярніся і сыдзі. Калі дзяўчынка супакоіцца, яна прыйдзе да цябе, ты ў гэты момант павінна выкарыстаць тэхніку «я-паведамленне» і сказаць: «Маш, мне сёння было вельмі балюча». — «Мама, ты сама вінавата». — «Магчыма, Маша». Апусціцеся з п'едэстала. Дазвольце сабе і сваім дзецям памыляцца, гэта нармальна.

**Цудоўная тэхніка «сэндвіча».** Калі хочаце сказаць штосьці непрыемнае свайму падлетку, пачынайце з добрага і завяршайце таксама на пазітыўнай ноце. Гэтую тэхніку часта раяць настаўнікам. Напрыклад, праверыла Ганна Іванаўна кантрольную работу вучня і кажа: «Жэня, работа мне вельмі падабаецца. Толькі вось тут хацелася б, каб у цябе памянялася «о» на «а», а «ы» на «і». Дзіця на фоне пазітыву пачуе вашу карэктную крытыку. Але, каб не засталося адмоўнага прысмаку, закрыйце сваё паведамленне «плюсікам»: «Тым не менш, работа цудоўная, Жэня, я проста шчаслівая чытаць яе». Чаму тэхнікі «сэндвіча» і «я-паведамленне» не выкарыстоўваць у жыцці з мужам, жонкай, бацькамі, калегамі, сябрамі? Гэта ж фантастыка. Вы дасягаеце выніку, не робячы балюча сваім блізкім.

**Каб выклікаць прыхільнасць сваіх кліентаў, я часта выкарыстоўваю правіла трох «Так».** «Ой, на вуліцы дождж, вецер... Напэўна, вельмі непрыемна». — «Так», — пагаджаецца. — «Давайце парасон сюды паставім. Вам так зручна?» — «Так»... На трэцяе пытанне я таксама, хутчэй за ўсё, пачую станоўчы адказ. Усё, я ўжо «прыплюсавала» да сябе незнаёмага чалавека. Мама, што табе перашкаджае гэтак жа «прыплюсаваць» да сябе свайго сына? Раніцай бачыш, што ён не хоча ўставаць, чаму б не сказаць: «Хочаш яшчэ паспаць? Я цябе разумею. Мне таксама так не хочацца на работу». «Не хочаш ісці ў школу, бо не зрабіў англійскую? Страшна, двойку паставяць? Яшчэ б, я цябе разумею».

**Не трэба змагацца. У вайне з падлеткам вы абое прайграеце.** Для пераходнага ўзросту і так натуральным з'яўляецца працэс сепарацыі. А калі вы ваюеце, аддзяленне адбываецца яшчэ інтэнсіўней. І ён жа выштурхоўваецца кудысьці. Добра, калі кампанія, дзе яго зразумеюць, станоўчая. А калі не? Скажуць: «Ды ну, пашлі сваіх продкаў, хадзем вып'ем піўка». Ці, што яшчэ страшней, — прапануюць пакаштаваць наркотыкі.

**Не ўсе паддаюцца ўплыву дрэннай кампаніі.** Самае страшнае ў жыцці — убачыць вочы мамы, у якой у анкацэнтры ляжыць дзіця. Неяк адна такая, да гэтага вельмі амбіцыйная, мама мне сказала: «А мне цяпер усё адно, што «людзі скажуць», усё адно, як ён вучыцца. Мне сёння трэба, каб мой сын быў жывы».

Адзін з варыянтаў абсцэньвання — халодная мама, якая не дае эмацыянальнай зваротнай сувязі. 14-гадовы сын крычыць у трубку: «Я яе бачу, яна пайшла з Ягорам. Я больш не хачу жыць! Мама ж, замест таго каб раздзяліць з сынам яго гора, паказаць «мне гэтаксама балюча, што яна пайшла з іншым, як і табе», сказаць «ну, хочаш я пайду паб'ю гэтага Ягора», толькі робіць выгляд, што слухае, паралельна мыючы посуд, ён жа застаецца сам-насам са сваім горам. «Мама не разумее. Тату я сказаць не магу, бо пачую заўсёднае «Ты што, не мужык?» Так бацькі самі, уласнымі рукамі, адразаюць па кавалачку сувязь з дзіцем. Ён прыйшоў да Валеркі. «Э, зараз мы вып'ем і паб'ём яго». — «О, Валерка адгукнуўся, я для яго не пустое месца». Быў у маёй практыцы выпадак, калі падлетак трапіў у секту. Тата і мама яго не чулі, а там пачулі...

**Падлетак павінен ведаць, што курыць шкодна для здароўя, што інфекцыі разносяцца палавым шляхам...** І лепш, калі ён пра тое даведаецца ад мамы і таты. Думкі, якія бацькі кідаюць у сямейным коле, напрыклад, за абедам — бясцэнныя ў гэтым плане. Ведаю тату, які разам са сваімі дочкамі рэгулярна глядзіць падлеткавыя фільмы. «Фу, як непрыгожа, калі ў дзяўчыны цыгарэта ў зубах. Дурніца, не разумее, што можа зарабіць сабе рак лёгкіх», — каментуе ён чарговы эпізод услых. Проста ненавязліва выказаў сваё стаўленне да курэння, але я перакананая, што дзяўчынкі пасля гэтай фразы наўрад ці захочуць узяць у рукі цыгарэты.



### Пра гарачы кубак ды халодную маму

**Задача бацькоў — стварыць дома востраў бяспекі, дзе дзіця будуць паважаць, прымаць.** Прыняцце — гэта, напэўна, самае галоўнае. Не чытайце натацыі, пазбягайце адкрытай крытыкі. Асноўная тэхніка зносін з падлеткам — праз пытанні. Падчас маналогу засвойваецца вельмі мала інфармацыі. Пры гэтым пытанні не павінны насіць характар: «Ну што, як сёння, Мар'я Іванаўна ўваліла за англійскую?» Прыбярыце яхіднасць. Забудзьцеся пра такія фразы, як «О, вядома, увесь у свайго татачку», або «Вунь, паглядзі, Светка вучыцца на адны дзясяткі, не тое, што ты». Не параўноўвайце, не прыніжайце, не абзывайце. Гэта вельмі раніць падлетка.

**Я — дарослая, у мяне ёсць жыццёвы досвед.** А хто такі падлетак? У яго ж унутры — «кактэйль Молатава» з гармонаў, які ў любы момант можа «выбухнуць». Калі мне нехта нахаміў, я магу паспачуваць гэтаму чалавеку. У падлетка ж ідзе сацыяльнае нараджэнне, ён толькі вучыцца выбудоўваць адносіны. «Хацеў уліцца ў кампанію, але мяне адштурхнулі». «Дзяўчынка падабаецца, не ведаю, як падысці»...

**Часта бацькі несур'ёзна ставяцца да першага кахання сваіх дзяцей.** «Знайшоў з-за чаго перажываць, у цябе яшчэ столькі раманаў будзе». За гэтай фразай стаіць абясцэньванне. Абясцэньванне — адна з самых цяжкіх псіхалагічных траўмаў. Прычым абясцэніць можна не толькі пры дапамозе слоў.

**Мамы часта кажуць сваім маленькім гарэзам: «Не чапай гарачы кубак, апячэшся».** Я заўсёды раю: дайце яму дакрануцца, ён жа не пампэ ад гэтага.... Але напярэдадні абавязкова папярэдзьце: «Кубак гарачы, ты апячэшся, будзе балюча». Пасля таго як малы адхапіў руку, трэба, супакойваючы яго, падмацаваць свае словы: «Вось бачыш, як балюча, гарачы кубак лепш не чапаць». Так паступова фарміруецца давер да маміных слоў. Да падлеткавага ўзросту ў яго ўжо на падкоркавай зоне будзе выпрацавана звычка — бацькі вельмі часта маюць рацыю. І ў складанай сітуацыі, калі патрэбна будзе парада ці дапамога, сын ці дачка прыйдуць да мамы і таты, а не да выпадковых знаёмых.

### Пра нерэалізаваныя амбіцыі ды асобны пакой

**Падлетак вярнуўся дамоў са школы, а мама звыкла, нават не гледзячы ў яго бок, кінула з парога: «Саша, вынесі смецце».** І чуе ў адказ грубае «Сама вынесі». Вось так на пустым месцы разгараецца канфлікт. Ты ж не ведаеш, што там адбылося, можа, чарговы Іваноў прынізіў яго перад усім класам, — дома, у яго будзе вельмі хваравітая рэакцыя на вынас смецця. Давайце будзем больш уважлівымі і гібкімі ў адносінах.

**Два-тры працэнты такога захворвання, як шызафрэнія, прыходзіцца на падлеткавы ўзрост.** Гэта вельмі шмат. Я магу зразумець, калі ёсць спадчынны фактар, а калі тата і мама здаровыя... Вы ніколі не задумваліся, што з'яўляецца прычынай? Нядаўна даведалася, што, аказваецца, у дзяцей з сіндромам Даўна рызыка анказахворванняў роўная нулю — гэта сонечныя дзеткі, яны да ўсяго ставяцца лёгка, з усмешкай. Часам, калі мама «заядае» сына ці дачку, хочацца прапанаваць: схадзіце паглядзіце, колькі нашых падлеткаў лечыцца ў анкацэнтры... Ведаю бацькоў, якія дазналіся, што ў дзіцяці была спроба суіцыду, толькі тады, калі праходзілі планавую медкамісію і ўбачылі шрамы на нагах і руках. Не падводзьце сваіх дзетак да непапраўнай рысы, вы ж не для таго падарылі ім жыццё...

**Я спакойная, калі мама тэлефануе з канкрэтным запытам:** «Можна я прывяду сына на дыягностыку? А потым вы мне дасцё канкрэтныя рэкамендацыі, што я ў сабе павінна памяняць». Такая мама — на вагу золата. У полі такой мамы сацыяльнае нараджэнне будзе не такім балючым. Яна будзе не толькі абязбольвальным сродкам, але і дасць свайму дзіцяці расці праз боль.

**Бацькі ніяк не могуць зразумець, што іх дзеці становяцца дарослымі.** І нават калі выдзелілі ім асобны пакой, усё адно заходзяць туды, як да сябе. Памятаю, калі стукала ў дзверы да свайго дзесяцігадовага сына: «Міша, можна?» — у мяне было столькі гордасці ўнутры. Я не крыўдзілася, калі ён некалькі раз сказаў: «Мам, я заняты, давай пазней». Бо разумела, што тым самым мой сын вучыўся выбудоўваць свае межы і, адпаведна, паважаць чужыя. Я яму ў гэтым дапамагала. Неяк адна мама сказала сабе ў апраўданне: «Я ж у сваёй кватэры. А раптам ён зачыніўся і колецца?» Дык ён і будзе калоцца. Падлетку патрэбныя давер і павага, таму пакіньце вашы пагрозы і крыкі за дзвярыма. І ў наступны раз не забудзьцеся пастукацца.

**Але як дастукацца да мамы?..** Яна кажа: «Я цягну ўсё на сабе, працую на дзвюх работах». Часам мне хочацца сказаць: «Слухай, кінь ты другую работу». Няхай вы не з'ясце лішні раз гэтыя чыпсы ды паглядзіце парнафільм. Яна не адна будзе яго глядзець. І ты, мама, ёй раскажаш: «Слухай, тут утрыравана брудна паказана, у жыцці па-іншаму». А замест таго мама прыходзіць дадому стомленая і пачынае «гаўкаць». Самае страшнае, што дзіця можа замкнуцца, аддаліцца і перастаць давяраць.

**Мама павінна быць цёплай.** Каб дзеці ведалі, што ёсць чалавек, які ў любой сітуацыі будзе на тваім баку, які не пачне з парога сыпаць прэтэнзіямі. Мамы, паслухайце яшчэ раз песню Міхаіла Баярскага «Зеленоглазое такси». Там гаворка ідзе не пра палюбоўніцу, як многія думаюць, а пра маму. Паверце, у дзяцей абавязкова будзе месца для бацькоў, калі бацькі класныя і ўсё разумеюць.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# «Больш, чым з мужам, мне пашанцавала з бацькам маіх дзяцей»

### Тайм-менеджмент, якога няма

«У мяне няма ніякага сакрэту, як паспяваць клапаціцца пра сям'ю і займацца работай. Я проста жыву, як умею, стараюся лепш. Мне сапраўды пашанцавала з мужам, ён вельмі дапамагае з дзецьмі. Мне пашчасціла з маім татам, з нашымі бабулямі, якія заўсёды побач. І дзякуючы ім, мая асноўная дзейнасць, мая кар'ера не спыняюцца. І шчыра кажучы, я слаба ўяўляю, што было б, калі б мяне спынілі. Вось цяпер у нас два тыдні паўзы, і я тры дні магу дома пасядзець. Але ўжо пад канец першага дня мне становіцца цяжка. Мне трэба ўвесь час рухацца. Я разумею, што пастаянна сядзець дома — гэта не маё. Хоць чалавек прывыкае да ўсяго. Таму каб не даць сабе прывыкнуць да марнавання часу, водпуск бяру кароткі. У мяне не было паўнавартаснага дэкрэтнага водпуску. Я нават жартую, што калі вырашымся на трэцяга, то гэта мой апошні шанц паспрабаваць сябе ў ролі мамы немаўляці на сто працэнтаў. Вядома, калі я кудысьці з'язджаю адна, сэрца шчыміць. Але дастаткова ўліцца ў работу — і лягчэй становіцца. Часам хочацца быць з дзецьмі 24 гадзіны сем дзён на тыдзень. Часам хочацца ад усяго абстрагавацца і заняцца толькі сваімі справамі. Гэта заўсёды розныя адчуванні. Я разумею, што ўжо больш ніколі не буду належаць толькі сабе. І часам гляджу на іх, на тое, як яны гуляюць, нешта робяць упершыню, і думаю: Божа, гэта мой працяг, гэта так крута, яны такія геніяльныя. І гэта неверагодна».

### #малышкаотмолашки і #мальчишкаотмолашки

«Цяпер у Веры ўзрост з шыкоўнымі пытаннямі, з шыкоўнымі развагамі аб людзях і жыцці. Вось мы едзем і бачым кабылу з жарабём, Віця ёй тлумачыць, што гэта жарабя і яго мама, што яно да мамы цягнецца. І Вера пытаецца: «А як я зразумела, што вы мае бацькі?» Калі тлумачыць дзіцяці нешта простае, трэба быць гатовымі пачуць вельмі сур'ёзнае пытанне. Мы ўжо бралі Веру на пахаванне, гэта таксама частка жыцця, і мы лічым, што дзіцяці трэба ведаць пра жыццё і смерць. І, відаць, яе так уразіла, што яна ў мяне пытаецца: «Мама, вось мы яе ў зямлю закапалі, а ты кажаш, што яна на небе». І яна ж мае рацыю. І як чатырохгадоваму дзіцяці ўсё зразумела растлумачыць? І такіх цікаўнасцяў з Верай цяпер вельмі шмат.

За Данькам таксама вельмі цікава назіраць. Гэта фенаменальна добры хлопчык. І ён вельмі прывязаны да Віці. Мне здаецца, што Віця цяпер перажывае перыяд, ад якога ва ўсіх мам валасы ўстаюць дыбам. Гэта калі тваё дзіця ад цябе не адыходзіць ні на секунду. Данік ні на імгненне не можа пакінуць Віцю. І так было з самага нараджэння. Я нават жартавала, што Віцю засталося толькі грудзьмі карміць. Вера лёгка ішла на кантакт з усімі, а Даньку ніхто, акрамя таты, здаецца, і не патрэбен. Гэта ўнікальна.

Вера ў нас хітруга. Таму, калі нарадзіўся Данька, яна не паказвала, што адчувае. Але па паводзінах можна была зразумець, што яна

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)



раўнуе. Цяпер, калі ён падрос, ужо не так. Але відаць, што часам Вера не да канца разумее, што гэта не лялька, а жывы чалавек. Разам з тым, заўважна, што яна адчувае, — гэта яе родны чалавек. Калі з садка прыязджаем, бачу, як яны сумавалі адно па адным. Калі мы кудысьці ідзём і кагосьці сустракаем, яна заўсёды кажа: «гэта мой брат» ці «не чапай майго брата». Калі Вера плача, Данік яе шкадуе, абдымае, цалуе. Я думаю, што ў будучым нас чакае і шмат сварак, бо тут два моцных характары. Але нават у такім малым узросце ёсць разуменне, што яны родныя. І гэта вельмі важна.

Вонкава нашы дзеці падобныя да Віці, асабліва калі зусім маленькія былі. Такія ж светленькія. Але мне ніколі не было важна, каб мае дзеці былі падобныя да мяне. Прыгожыя атрымаліся — і дзякуй богу. Іншая справа — характар. Вера — гэта я і крыху ўзрыўнога Віці. Яна вельмі ўпартая, можа давесці дарослага чалавека, і яна заўсёды дабіваецца свайго. Вера стараецца сама ўсё рабіць. Ну, пра Даньку яшчэ рана нешта казаць. Вакол яго цяпер усе круцяцца».

«Бацькі ў мяне нармальныя, добрыя. І брацік у мяне добры. З Данікам мы балуемся, гуляем. Тата мяне ўжо навучыў у футбол гуляць. Я нават яму некалькі галоў забіла. І яшчэ я люблю на планшэце глядзець відэа, як тата ў футбол гуляе, а мама са стужкай выступае, прыгожая такая», — дадае Вера.

### Вера і гімнастыка

«Мама заўсёды бярэ мяне ў залу на трэніроўкі. І я ўжо выступала на «Хрустальнай ружы». Я баялася, але выступіла. Калі я нешта забывалася, я глядзела на дзяўчынак, як трэба рабіць, і супакойвалася. Я баялася выступаць перад гледачамі, але трэнеры мяне супакойвалі. Але потым з гледачамі спадабалася выступаць, на мяне ўсё глядзелі і апладзіравалі. І гэта было, як магія», — дзеліцца Вера. У паказальным нумары на міжнародным турніры «Хрустальная ружа» па мастацкай гімнастыцы адбыўся яе сцэнічны дэбют.

«Вера вырасла ў нашай зале. Яна там як дачка палка, яе ўсе ведаюць, яна ўсіх ведае. Залу ведае лепш, чым родны дом. Я ніколі не баялася браць яе туды, дзе дарослыя. Усё роўна калісьці яна з імі сустрэнецца. І нават перад пачаткам дзіцячага садка мы хваляваліся, што ёй там будзе сумна, бо яна больш ведае дарослых, чым сваіх равеснікаў. Але яна ўцягнулася, і мы зразумелі, што Вера з усімі знойдзе агульную мову.

А гімнастыкай Вера пакуль не займаецца. У верасні пойдзе займацца ў школу Сашы Наркевіч. Яна выступіла на «Хрустальнай ружы», і ёй захацелася. Яе гэта вельмі ўразіла». «Я ўжо магу многія элементы рабіць, і са стужкай, і з абручом, і з булавамі. Больш за ўсё мне булавы падабаюцца. Сашу Наркевіч я даўно ведаю. І хачу хадзіць да яе займацца», — тлумачыць Вера.

непрафесіянальна гуляе ў хакей, яна разам з ім ходзіць на гульні, ведае, пад якім ён нумарам, хвалюецца, падтрымлівае».

«Папа двойчы выйграў. А калі прайграў, я плакала. І дзядзя з татавай каманды сказаў, што яны будуць выйграваць, каб я не плакала», — дзеліцца Вера.

### «Мама ў мяне нястрогая»

«У псіхалогіі ёсць такое правіла: лічыш да трох, і дзіця павінна супакоіцца. Я праверыла яго на Веры, і яно працуе. Яна не слухаецца. Я кажу «раз» — Вера збаўляе абароты і да трох ужо разумее, што мама жартаваць не будзе, таму трэба адмовіцца ад ідэі.

Часам бывае, яна мяне зусім не слухае. Сто разоў ёй паўтараю — і ніякага эфекту. Тады я ўжо выходжу з сябе і кажу: «Вось я ад цябе сыду, і што ты тады будзеш рабіць?» І яна ўжо разумее, што справа дрэнь, і супакойваецца. Гэта бывае рэдка, кажу я тое на эмоцыях, калі ўжо дапякае. Потым мне вельмі сорамна за свае словы. Але мы ўсе людзі, усе не жалезныя, і я не выключэнне. Магчыма, у сацыяльных сетках можа стварыцца ўражанне, што мы такія спакойныя і вытрыманыя бацькі. Але гэта не заўсёды так».

### «Будуць свае дзеці — зразумееш»

«Калі з'яўляюцца свае дзеці, разумееш абсалютна ўсё, што казалі табе бацькі. Становяцца зразумелымі ўсе іх перажыванні і турботы. Кажуць, што каб зразумець чалавека, трэба абуць яго абутак. Вось каб зразумець сваіх бацькоў, трэба самім стаць бацькамі.



«Мы з Віцем разумеем, што можам даць сваім дзецям больш, чым маглі даць нам нашы бацькі. Мы можам дазволіць сабе любую секцыю. Але ў нас няма пункта, што нашы дзеці абавязкова займацца спортам, музыкай ці яшчэ нечым. Але мы разумеем, што дзеці павінны быць занятыя. Чым менавіта — няхай вырашаюць самі. Мы не паскараем дзяцінства, няхай яно ідзе, як трэба. Хочацца ім цяпер у пяску капацца — калі ласка, хоча Вера займацца гімнастыкай — будзе хадзіць да Сашы Наркевіч. Мы даём ім свабоду. Абсалютная строгасць праяўляецца толькі там, дзе справа датычыцца жыцця і смерці: паводзіны на дарозе, з агнём і гэтак далей. У астатнім — толькі іх жаданні. Нядаўна Вера зацікавілася кнігамі. Я сама шмат чытаю, яна пастаянна бачыць мяне з кнігай. І ўжо сама просіць, каб ёй пачыталі, свае дзіцячыя кнігі, якіх у яе вельмі шмат, бярэ з сабой у садок. Віця

Я добра памятаю, як мама вадзіла нас у тэатр, амаль кожныя выхадныя. Часам так не хацелася, што мама літаральна нас цягнула. А сёння я прыходжу ў тэатр і думаю, якая мая мама малайчына, што паказала нам гэта. Вядома, я буду гэтаксама рабіць і са сваімі дзецьмі. Ніхто не паспее за ўсё жыццё паглядзець усе спектаклі ці фільмы, прачытаць усе кнігі, але хочацца паспець як мага больш, выкарыстаць кожны момант. І гэтаму я хачу навучыць сваіх дзяцей.

У маім дзяцінстве побач з намі пастаянна былі хатнія жывёлы. Я не ведаю, як можна жыць, расці без іх. Маім мопсам Чупе і Шані больш за дзесяць гадоў. То-бок мае дзеці нарадзіліся пры гэтых сабаках, яны жывуць з імі. І яны ўжо ўмеюць жыць з іншымі істотамі, разумеюць, што гэта не цацка, што аб іх трэба клапаціцца. Калі Вера была маленькая, сабакі пастаянна спалі побач з ёю. Данік цяпер то нешта смачнае ім дасць, то проста пагладзіць. Відаць, што ён іх любіць».

### Цярпенне і любоў

«Самае складанае ў выхаванні дзяцей — захоўваць цярпенне. І гэта самае галоўнае. Яго трэба трэніраваць і разумець, што гэта проста такі час. І трэба старацца ўсё рабіць з любоўю, нават калі стаміўся. Гэта твае дзеці. Ты быў да іх гатовы. Табе трэба іх выхаваць і адпусціць у жыццё. Яны побач з табой зусім ненадоўга, і ў прынцыпе няма часу крыўдзіцца на іх. Ёсць толькі кароткі прамежак часу, калі перад табой маленькі чалавек, які фарміруецца ў асобу. І ты кайфуеш ад таго, што яны першы раз робяць свае крокі, кажуць «мама» ці «тата». І ты разумееш, што сам некалі быў такім жа, і здзіўляешся ад таго, як многа можа зрабіць чалавек за кароткі прамежак час. Таму цярпенне і любоў — два залатыя правілы. Ужо потым можна прывіваць дысцыпліну, правілы, традыцыі. Але без цярпення і любові ўсё гэта не мае сэнсу».

### Гэты шлях трэба праходзіць удваіх

«Зразумела, калі з'яўляюцца дзеці, мяняюцца адносіны і з мужам. І тут таксама залатое правіла — цярпенне і любоў. Усё можна вырашыць, калі ты ўмееш своечасова нешта не заўважыць, прамаўчаць, своечасова супакоіцца. Гэта важна, бо жыццё мяняецца ва ўсіх. Пасварыцца шмат розуму не трэба, а трымацца разам куды складаней. Будуць і недасыпанні, і стомленасць, і мільён сарваных планаў. І гэта трэба праходзіць удваіх. Трэба ўсведамляць, што вы бацькі і інакш не будзе ніколі. Цярпенне і любоў нас ратуюць. Нас ратуе і дапамога нашых родных. Удваіх можна спраўляцца, але ўсё роўна павінны быць блізкія людзі, якія будуць побач, якія падтрымаюць і дапамогуць.

Больш, чым з мужам, мне пашанцавала з бацькам маіх дзяцей. Я не ўяўляю, хто б, акрамя Віці, мог спраўляцца з двума дзецьмі і з нестэрэатыпнай жонкай. А ў яго ўсё атрымліваецца. Дарагога варта тое, што Віця бяжыць з работы дадому — да дзяцей, да сям'і. Часам нават на нейкіх мерапрыемствах ён мне кажа: «У нас дзеці, пойдзем дадому». Калі мы недзе затрымаемся, ён будзе перажываць, што Данік будзе засынаць без нас. Ён будзе перажываць, калі я забяру Веру на 10 хвілін пазней, чым мы з ёй дамовіліся. Хоць Вера і не заўважыць тых 10 хвілін і добра правядзе іх у садку. Але Віця будзе хвалявацца, бо мы ёй абяцалі. Ён праяўляе такія бацькоўскія рэчы і паводзіны, якія мне як маме незразумелыя. Часам я нават думаю, што я павінна сябе паводзіць, як паводзіць ён».

### Шчаслівая мама — шчаслівае дзіця

«Калі я не ў настроі, не ў настроі ўсе. І дзеці так усё адчуваюць, што дзіву даешся. Вера нават можа Віцю сказаць: «Не чапай маму». Яны ўсё гэта адчуваюць. Таму, выхоўваючы дзяцей, трэба пачаць з сябе».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з асабістага архіва гераіні.**

# ДАЧЦЭ — КВАТЭРУ, СЫНУ — АЎТАМАБІЛЬ! А КАТУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Пакінуць спадчыну, напрыклад, кату, згодна з беларускім заканадаўствам, немагчыма. Гэтаксама як і скласці завяшчанне з неправамернымі ўмовамі, накшталт «мая маёмасць адыходзіць дачцэ, аднак толькі калі яна потым завяшчае яе свайму сыну». Альбо «завяшчаю кватэру сыну, калі ён зменіць веравызнанне». Такія завяшчанні не будуць мець юрыдычнай сілы.

*— У той жа час у завяшчанне можна ўключыць ускладанне, тобок папрасіць спадчынніка выканаць волю памерлага, — абазначыла натарыус. — Напрыклад, указаць, што дачка ці сусед павінны клапаціцца пра ката нябожчыка. Альбо можна напісаць «завяшчаю ўсю сваю маёмасць, якая будзе належаць мне на момант смерці (з чаго б яна ні складалася і дзе б ні знаходзілася, нават тая, якая пакуль будуецца), унуку Іванову Івану Іванавічу і ўскладаю на яго абавязацельства ўступіць вучням школы № 2 Мінска ў карыстанне маёй бібліятэкай».*

**У завяшчанні могуць утрымлівацца не толькі абавязковыя для выканання правамерныя ўмовы, але і пажаданні спадчынадаўца.** Напрыклад, «завяшчаю дом дачцэ і сыну пароўну, аднак выказваю пажаданне, каб дачка карысталася першым паверхам, а сын — другім». Калі нашчадкі не пагодзяцца з такой умовай-просьбай, то ім прыйдзецца вызначаць парадак карыстання домам праз суд, удакладніла юрыст.

## ТАЯМНІЦА, СВЕДКІ І ЗАКРЫТАЕ ЗАВЯШЧАННЕ

Завяшчаць можна ўсё што заўгодна: нерухомасць, уклады, калекцыі, каштоўнасці, аўтамабілі і нават кватэру ці дом, які яшчэ будуецца. Дакумент павінен пісацца ад рукі і складаецца ў двух экзэмплярах: адзін будзе захоўвацца ў натарыуса, другі — у завяшчальніка. Такога паняцця, як лічбавае завяшчанне, не існуе.

*— У завяшчанні прапісваюцца час і месца яго складання, імя, прозвішча і імя па бацьку, дата нараджэння, асабісты нумар, месца жыхарства завяшчальніка, а таксама ступень сваяцтва і поўнае імя спадчыннікаў. Не проста ўнук ці жонка, а з указаннем іх поўнага імя, — дадала натарыус. — Здараецца, што пасведчанні аб нараджэнні ці шлюбе губляюцца, а аднаўляць іх цяжка, і немагчыма пацвердзіць ступень сваяцтва. У гэтым выпадку атрымаць спадчыну ўказаныя ў завяшчанні асобы могуць толькі па сваім імі, якое напісана ў дакуменце, як пабочныя грамадзяне.*

Можна скласці таксама закрытае завяшчанне, змест якога не ведае нават натарыус. У гэтым выпадку чалавеку тлумачыцца, хто мае права на абавязковую долю спадчыны, аднак яго волю даведваюцца толькі пасля смерці. Закрытае завяшчанне пішацца і падпісваецца ўласнаручна, таму тыя, хто не можа пісаць, такі дакумент скласці не могуць. Закрытае завяшчанне перадаецца натарыусу ў прысутнасці двух сведак, якія распісваюцца на канверце, аднак такіх дакументаў зусім няшмат, удакладніла Надзея Шупенька:

— Пры гэтым захоўваецца тайна завяшчання — пра дакумент ведаюць толькі спадчынадавец і натарыус. Становяцца вядомымі звесткі толькі пасля смерці чалавека, і толькі спадчыннікам. Аднак могуць быць яшчэ сведкі, якія патрэбныя, калі чалавек з нейкіх прычын нездольны напісаць сваю волю ўласнаручна. Тады за спадчынадаўца завяшчанне піша натарыус у прысутнасці сведкі, які пацвярджае сапраўднасць дакумента і таксама папярэджваецца пра невыдаванне яго зместу, — расказала натарыус. — Калі ж чалавек не можа і падпісаць завяшчанне (з прычыны хваробы ці непісьменнасці), то патрэбны яшчэ адзін чалавек, які падпіша дакумент за завяшчальніка, а ў самім завяшчанні будзе ўказана прычына, чаму так адбылося. Калі завяшчанне складае іншаземец, прысутнічае перакладчык.

**Пандэмія моцна паўплывала на складанне завяшчанняў, і гэта пацвярджаюць лічбы. У 2019 годзе па Мінскай абласной натарыяльнай акрузе было засведчана 5306 завяшчанняў, у 2020-м — 6211, а летась — 7030.**



## АБАВЯЗКОВАЯ ДОЛЯ І ПАЗБАЎЛЕННЕ СПАДЧЫНЫ

Калі чалавек прыходзіць да натарыуса складаць завяшчанне (выключэнне толькі для тых, хто знаходзіцца ў бальніцы, доме састарэлых, ці моцна хворы дома — да іх спецыяліст прыедзе сам), натарыус высвятляе ўсе нюансы. Чаму чалавек хоча скласці завяшчанне, на чыю карысць робіцца дакумент, што атрымаюць іншыя спадчыннікі, і іншае. Такім чынам правяраецца яшчэ і яго дзеяздольнасць і добраахвотнасць, прычым робіцца гэта сам-насам з завяшчальнікам.

*— Незалежна ад таго, каму толькі пакідае спадчыну (гэта датычыцца і закрытага, і звычайнага завяшчання),* ***ёсць спадчыннікі, якія маюць права на абавязковую долю. Гэта непаўналетнія ці недзеяздольныя дзеці, а таксама бацькі, муж ці жонка, якія з'яўляюцца пенсіянерамі або інвалідамі.*** *Яны маюць права на не менш як палову долі, якая належала б ім пры ўспадкаванні па законе — калі б не было завяшчання, — растлумачыла спецыяліст. — Калі, напрыклад, усё завешчана дачцэ нябожчыка, аднак у яго жывая маці-пенсіянерка, яна будзе спадчынніцай на абавязковую долю. Аднак яна павінна заявіць свае правы на гэтую частку спадчыны на працягу шасці месяцаў пасля смерці сына — інакш яна лічыцца асобай, якая адмовілася ад спадчыны.*

**Мяняць сваё рашэнне і складаць новае завяшчанне можна колькі заўгодна разоў. Каштуе яго натарыяльнае пасведчанне адну базавую велічыню. Аспрэчыць завяшчанне даволі цяжка. Адмяніць завяшчанне можна, напісаўшы новае, альбо знішчыўшы ўсе копіі існуючага ва ўстаноўленым законам парадку.**

Калі спадчыннік прыходзіць адкрываць спадчыну, натарыус высвятляе ў яго, ці ёсць спадчыннікі на абавязковую долю ці іншыя спадчыннікі. Калі той кажа, што ёсць, і называе іх імёны, месца жыхарства ці работы, натарыус апавяшчае гэтых людзей пра наяўнасць спадчыны. А далей іх права — атрымліваць спадчыну ці не. Калі ж спадчыннік кажа, што больш нікога няма, акрамя яго, натарыус яго словы не правярае. І хоць наследнік і распісваецца за свае словы (праўда яны ці не), ніякай адказнасці ў выпадку хлусні ён не нясе.

**Падчас складання завяшчання натарыус прымае на веру, што ўсё, што спадчынадавец хоча пакінуць спадчыннікам, у яго ёсць. Наяўнасць спадчыны правяраецца толькі пасля смерці чалавека.**

*— Калі ў чалавека ёсць непаўналетнія дзеці, аднак ён не ўказаў іх у завяшчанні, а пакінуў усё іншаму спадчынніку, то законныя прадстаўнікі гэтых дзяцей усё роўна могуць на працягу шасці месяцаў з дня смерці спадчынадаўца заявіць права малых на іх частку спадчыны, — удакладніла юрыст. — Калі прайшло больш чым паўгода з моманту адкрыцця спадчыны, даказваць права непаўналетніх на спадчыну законным прадстаўнікам прыйдзецца праз суд.*

У завяшчанні можна даць любыя распараджэнні, якія не пярэчаць нормам закона і маралі. А яшчэ — указаць не толькі спадчыннікаў, але і тых спадчыннікаў па законе (першай чарзі), хто будзе пазбаўлены спадчыны. Непажаданых асоб завяшчальнік можа проста не ўказваць у завяшчанні, або дакладна прапісаць, каму з нашчадкаў пакідаць ён нічога не збіраецца, падкрэсліла Надзея Шупенька:

*— Пазбаўленне спадчыны, аднак, не датычыцца нашчадкаў таго чалавека, які нічога не атрымаў. Яны наследуюць спадчыну па праве прадстаўлення, калі толькі завяшчальнік не прапісаў у дакуменце адпаведных забарон на спадчыну і для іх. Нельга пазбавіць спадчыны і тых, хто мае права на абавязковую долю. Нават калі прапісаць у завяшчанні, што вы ім нічога не пакідаеце, сваю частку спадчыны яны атрымаюць.*

Пішуць завяшчанні, як правіла, людзі, якія дасягнулі пенсіённага ўзросту. Больш маладыя складаюць такія дакументы пры асаблівых умовах. Калі, напрыклад, работа звязаная з частымі палётамі або чалавека чакае складаная аперацыя, пасля якой ён можа стаць недзеяздольным.

**Ірына СІДАРОК.**

# ЦЫГАНЫ

— Дарынка, чула, заўтра да нас з Васілевіч прыедуць цыганы гандляваць адзежай усякай, я чуў, як бацька маці казаў, каб яна прыгатавала грошы і яды болей наварыла.

— А яды навошта болей? — пытае Дарынка брата.

— Ты што, не разумееш? Дык накарміць жа іх трэба, тады дзешавей прададуць штось, — тлумачыць сястры брат.

Дарынка з братамі, па звычцы, калі ў хату заходзяць чужыя людзі, заскокваюць на печ. На печы цёпла, высака, усё відаць, што робіцца ўнізе. Каб не так моташна было чакаць тых цыганоў, дзеці пачынаюць валтузіцца, дурэць. Маці завіхаецца каля яе і раз-пораз пакрыквае на малую «чэмер», каб не разнеслі печ.

Нарэшце са станцыі даносіцца свісток паравоза — гэта з Гомеля прыбывае ранішні цягнік. Вось ён пачахкаў на Хвойнічак. Недзе праз хвілін дзесяць бразгае клямка весніц, пачынае гаўкаць Шарык. Прыехалі, значыцца. І сапраўды, пад вокнамі мільгаюць галовы ў квяцістых хустках. У хату з шумам і гамам заходзяць тры цыганкі. Яны таўшчэзныя, як тыя копы сена, непавароткія. Але на вачах дзяцей чарнявыя госці хутка становяцца тонкімі. Аказваецца, пад верхняй непрыкметнай адзежай на іх надзета па некалькі кофтаў, навязана па некалькі вялікіх хустак. Усё гэтае багацце яны раскладваюць на маленькую канапу, развешваюць на спінкі крэслаў. З палатняных торбаў дастаюць некалькі пар румынак. Дарынка аж ледзь з печы не звальваецца, так хоча разглядзець усё бліжэй. Асабліва яе вабяць тыя румынкі — карычневыя боцікі са шнуркамі на высокіх абцасах.

Пакуль маладзіцы распранаюцца, Дарынчына маці накрывае на стол і запрашае гасцей «перакусіць з дарогі». Тыя доўга не цырымоняцца, не памыўшы нават рук, сядаюць за стол. Маці налівае ім і па чарцы самагонкі, сама ледзь прыгубляе за кампанію і бярэцца разглядаць тавар.

З кучы хустак-цыганак яна адразу выхоплівае вялікую чорную з кутасамі. Хустка надзіва прыгожая — уся ў ружах. Маці накідвае яе на плечы, потым ідзе да вялікага люстэрка, якое вісіць над сталом. Паварочваецца перад ім і так, і сяк. Дарынка не вытрымлівае:

— Мама, мама, етая, етая самая прыгожая! Бяры етую хустку, а калі я падрасту, дык ты мне яе падорыш!

Цыганкі смяюцца:

— Цікавая ў цябе малая, хазяйка, гэтая сапраўды самая пaглядная. Бяры — уступім.

Маці выбірае-купляе тую прыгожую хустку і румынкі. Хоча яшчэ і вігоневую кофту з кішэнямі, але грошай не хапае. Акрамя грошай, яна насыпае цыганкам торбу бульбы. У яе ж сыпле-кідае трохі цыбулі, кладзе на стол добры кус сала з кубла.

— Роза, — звяртаецца яна да старэйшай, — ты ж не забыла, што я цябе прасіла яшчэ той раз?

— Не забыла, дарагая, не забыла, залатая. Белую «цыганку» тваёй старэйшай дачцэ. А зялёную не хочаш, сваёй малой дачцэ? А чырвоную? Паглядзі, якія, аж гараць!

Маці ад тых чырвоных і зялёных хустак-цыганак адмахваецца — тут хоць бы за тое, што адабрала, хапіла грошай, дык і Анюта ж хоча белую з ружамі, з кутасамі. Такую, каб ні ў кога болей не было. Цыганкі абяцаюць прывезці.

А Дарынка таксама хоча хустку-цыганку — зялёную! У яе ж вочы зялёныя, дык і хустка ёй патрэбна зялёная. Вядома, цяпер хустка больш патрэбна старэйшай сястры, бо яна ўжо на выданні і ёй збіраецца пасаг у замужжа, а Дарыньцы, малой падшыванцы, трэба думаць не пра замужжа, а пра школу. Так што яна пачакае, падрасце, і тады і ў яе будзе хустка-цыганка — зялёная.

**Раіса ДЗЕЙКУН.**

Па палічках

# ПАЗБАВІЦЦА ЛІШНЯГА

## На якіх дыетах рэальна знізіць вагу і пры гэтым аздаравіцца?

**Падлічана, што прыёмам ежы чалавек заняты каля шасці гадоў свайго жыцця. І ад таго, што гэта будзе за ежа, залежыць і наша здароўе, і прыгажосць цела, і правільная вага.**

Не будзем спыняцца на экстрэмальных «аднаразовых» дыетах. Яны даюць надзвычай кароткачасовы эфект і пры гэтым становіцца сур'ёзным стрэсам для арганізма. Пагаворым пра больш «дарослыя» і адказныя спосабы прывесці вагу ў норму, губляючы ў сярэднім па 0,5-2 кг у тыдзень. Растлумачыць усе «за» і «супраць» папулярных дыет мы папрасілі **намесніка генеральнага дырэктара па стандартызацыі і якасці прадуктаў харчавання РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні», кандыдата тэхнічных навук, дацэнта Алену МАРГУНОВУ.**

— Я шмат кажу і пішу пра тое, што найлепшы спосаб знізіць вагу — не «цудадзейная дыета», а магчымасць перагледзець свае харчовыя звычкі, выбраць збалансаваны рацыён харчавання, знайсці аптымальную фізічную нагрузку. Але вельмі многія, першапачаткова сілкуючыся незбалансавана, ужываючы «мёртвую» ежу (паўфабрыкаты, вэнджаніну, фаст-фуд), спадзяюцца на імгненную карысць ад «чароўнай» дыеты. І такіх людзей хацелася б перасцерагчы. Дыеты сёння распрацаваны розныя, многія з іх сапраўды здольныя пазбавіць некалькіх кілаграмаў. І пры гэтым яны могуць быць небяспечныя менавіта для вас з прычыны індывідуальных асаблівасцяў арганізма.

### ЭФЕКТ — БУДЗЕ!

***— Давайце пагаворым пра найбольш папулярныя дыеты — складзём топ дыет-планаў харчавання, эфектыўнасць якіх пацверджана навуковымі даследаваннямі.***

— У першую чаргу гэта датычыцца дыет, якія маюць не эстэтычныя, а перш за ўсё лячэбныя мэты — іх уплыў на арганізм даследаваўся найбольш глыбока.

***— Міжземнаморская дыета была папулярная ў двухтысячных, але потым з'явілася меркаванне, што такі тып харчавання нехарактэрны для большасці паўночных краін, для нас гэта дорага і неэфектыўна...***

— **Міжземнаморская дыета**, сапраўды, заснаваная на ўжыванні прадуктаў харчавання, тыповых для Грэцыі і Італіі. Яе асноўны рацыён — злакавыя прадукты (неачышчаныя і неабсмажаныя крупы, хлеб і спагеці з мукі грубага памолу), рыба і морапрадукты, аліўкавы і іншыя алеі, гародніна і садавіна, арэхі. Дапускаецца чырвонае сухое віно — 250 мл у суткі, калі няма супрацьпаказанняў. Дыет-план абмяжоўвае ўжыванне чырвонага мяса, сметанковага масла, яек, салодкіх прысмакаў. У Беларусі да міжземнаморскай дыеты ставяцца без даверу: маўляў, у нас іншы клімат і харчовыя звычкі. Але, напрыклад, у краінах Скандынавіі міжземнаморская дыета «прыжылася» — яе адаптавалі і назвалі скандынаўскай. Гэты тып харчавання на самай справе просты і не залежыць ад кліматычных умоў. А карысць — у спажыванні вялікай колькасці поліненасычаных тлушчаў (іх крыніцы — раслінныя алеі: рапсавы, ільняны, кукурузны, слянечнікавы, рыба і арэхі) пры малой колькасці жывёльных насычаных тлушчаў і цукру. Як вынік, у краінах, дзе міжземнаморская дыета стала папулярнай, ёсць зніжэнне ўзроўню сардэчна-сасудзістых захворванняў.

***— Якія яшчэ дыеты маюць доказаную эфектыўнасць?***

— Сёння шырока абмяркоўваецца **кетагенная дыета** (нізкавугляводная дыета супраць анкалагічных захворванняў). Яна заснавана на абмежаваным спажыванні вугляводаў. Арганізм пачынае актыўна здабываць энергію з тлушчу (працэс носіць назву «кетоз», ён і даў імя дыеце). Мэта такой дыеты — пазбавіць пухлінныя клеткі крыніцы глюкозы, якую яны актыўна спажываюць для росту і размнажэння, у той жа час павысіць узровень кетонавых цел для вытворчасці энергіі ў здаровых клетках. Аснову рацыёну складаюць мясныя і малочныя прадукты сярэдняй тлустасці (2,5-3,5 %) як крыніца бялкоў. Дыета прадугледжвае таксама ўжыванне раслінных алеяў, арэхаў, авакада, алівак як крыніц поліненасычаных тлушчаў. У спіс абмежаванага спажывання трапляюць хлеб, макаронныя вырабы, салодкія прысмакі (ад іх лепш наогул адмовіцца). У рацыёне павінны прысутнічаць гародніна і садавіна з нізкім утрыманнем крухмалу. Прысмакі варта замяніць садавінай і ягадамі (клубніцы, парэчкі, апельсіны, грэйпфруты). Дарэчы, паступовую, плаўную страту вагі практычна ўсе лячэбныя дыеты таксама забяспечаць.

Яшчэ адна эфектыўная дыета — **для працаздольнасці мозга**. Гэта «сплаў» міжземнаморскай дыеты і DASH (дыеталагічны падыход да лячэння гіпертаніі). Доказана, што такая дыета зніжае рызыку развіцця хваробы Альцгеймера на 35—50 %, запавольвае кагнітыўныя парушэнні ў людзей сталага ўзросту, дае засцярогу ад дэменцыі і спрыяе захаванню працаздольнасці мозга. Яе складаюць: нятлустае белае мяса, рыба на пары, арэхі і ягады, алей, садавіна і гародніна без абмежаванняў. А таксама чырвонае сухое віно (келіх у дзень пры адсутнасці супрацьпаказанняў). Абмежаванні — чырвонае мяса і насычаныя тлушчы, крыніцамі якіх з'яўляюцца тлустае мяса і малочныя прадукты высокай тлустасці. Пад абсалютнай забаронай транстлушчы, крыніцы якіх — маргарыны, мучныя кандытарскія вырабы і фаст-фуд. Абавязковыя да ўжывання зялёная ліставая гародніна, якая ўтрымлівае лютэін, і наогул любая гародніна. Мінімум раз на тыдзень рэкамендуецца есці рыбу, двойчы на тыдзень — мяса птушкі. Салаты запраўляем раслінным алеем, а ў якасці перакусу выкарыстоўваем арэхі і ягады.

**Дыета для засцярогі сэрца і сасудаў** DASH, акрамя страты вагі, дапамагае знізіць рызыку развіцця інсультаў і інфарктаў, паляпшае самаадчуванне гіпертонікаў. У рацыён тут уваходзяць злакавыя прадукты з неачышчаных і неабсмажаных круп, мукі грубага памолу, нятлустае белае мяса, рыба і морапрадукты, нятлустыя, але не абястлушчаныя (да 2,5 % тлустасці) малочныя прадукты, аліўкавы, рапсавы, ільняны алеі, гародніна і садавіна, арэхі. Пад абмежаванне трапляе соль: не больш за 5 г у суткі, уключаючы «ўтоеную» соль у гатовых прадуктах; на фоне павышанага артэрыяльнага ціску — не больш за 3 г у суткі. Важна абмежаваць спажыванне масла, тлустых малочных і мясных прадуктаў. Пры дыягназе «гіпертанія» тлушч лепш скарацыць максімальна. Дарэчы, DASH вельмі эфектыўна дапамагае кантраляваць вагу, і акрамя таго, што спрыяе паніжэнню артэрыяльнага ціску, памяншае рызыку развіцця захворванняў нырак. У нерафінаваных алеях утрымліваюцца фітастэрыны і фітастэролы, якія паляпшаюць ліпідны баланс арганізма і перашкаджаюць развіццю атэрасклерозу.



***— Вяртаючыся да страты вагі як галоўнай мэты: бялковыя дыеты лічацца эфектыўным спосабам скінуць лішнія кілаграмы...***

— У аснове бялковых дыет рацыён, багаты на бялковую ежу, што часткова або цалкам выключае вугляводы і тлушчы. Рацыя тут ёсць: паступленне ў арганізм пратэінаў, неабходных для харчавання касцявой і мышачнай сістэм, пры абмежаванні прадуктаў, багатых на тлушчы і хуткія вугляводы, запускае спальванне тлушчавай масы. Але ў такога рацыёну — цэлы шэраг супрацьпаказанняў: парушэнне ферментатыўных функцый, захворванні нырак, рызыка тромбаўтварэння, паталогіі сардэчна-сасудзістай сістэмы. Бялковае харчаванне прынясе карысць, калі чалавек актыўна займаецца спортам і пры гэтым у яго вольны графік работы: такі рацыён харчавання прадугледжвае рэгулярныя прыёмы ежы.

### ДЫЕТА АБО ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПЛАН?

***— Да якіх з папулярных дыет варта ставіцца з асцярожнасцю?***

— Напрыклад, да так званай **японскай дыеты**. Яна мае на ўвазе поўнае выключэнне з рацыёну цукру, солі, алкаголю, мучнога і кандытарскіх вырабаў. Рэжым харчавання будуецца па схеме, разлічанай на 7, 10 або 14 дзён, у час якіх прыйдзецца вельмі строга прытрымлівацца меню. Нават пры павярхоўнай яго ацэнцы становіцца ясна, што да японскай кухні дыета адносін не мае. Японцы традыцыйна сілкуюцца стравамі, у якіх зроблены акцэнт на павольныя вугляводы (рыс), для іх харчавання характэрная вялікая колькасць морапрадуктаў, гародніны і садавіны (гэтым тлумачыцца вялікая колькасць доўгажыхароў у Японіі). Але дыет-план, вядомы пад назвай «японская дыета», — гэта мінімум вугляводаў: арганізм будзе губляць не тлушчавую, а мышачную тканку. І нават залішняе паступленне бялку не дапаможа спыніць працэс, а толькі прывядзе да павышанай нагрузкі на ферментную сістэму і ныркі. Яшчэ адна вельмі спрэчная з модных дыет — **па групе крыві**. Ідэя рознага рацыёну для людзей з рознымі групамі крыві нарадзілася ў натурапата Піцера Д'Адамо. Так, уладальнікам першай групы крыві дыета дазваляе ўжываць любое мяса, але рэкамендуецца пазбягаць амаль усёй гародніны і злакаў. Людзям з другой групай крыві, згодна з дыетай, трэба стаць вегетарыянцамі. Ёсць абмежаванні для трэцяй і чацвёртай груп. Дыета па групе крыві — досыць строгая, і прапануецца ўсім без выключэння людзям, незалежна ад іх роду дзейнасці, месца жыхарства, стану здароўя, іншых генетычных і фізіялагічных асаблівасцяў. Атрымліваецца, што людзі з першай групай крыві, якія павінны выключыць з рацыёну гародніну, будуць у групе рызыкі па захворваннях печані, нырак і падстраўнікавай залозы. А з другой групай — пазбаўленыя каштоўных амінакіслот і неабходнага для крыватварэння жалеза. Такім чынам, не варта гэтую дыету нават спрабаваць тым, у каго ёсць хранічныя захворванні страўнікава-кішачнага тракта, ды і ў цэлым да яе трэба ставіцца з асаблівай асцярогай.

***— Чаму вельмі часта «не працуюць» нават ухваленыя спецыялістамі дыеты?***

— Дыета — толькі часовая мера, а няправільныя харчовыя звычкі — з'ява, скажам так, хранічная. Часта модныя дыеты не збалансаваныя, характарызуюцца дэфіцытам вітамінаў і мінеральных рэчываў, і ў цэлым не заўсёды маюць пад сабой навуковы падмурак. І самае галоўнае, папулярныя дыеты апрыёры прапануюць нейкі ўніверсальны план харчавання: яны не ўлічваюць індывідуальных асаблівасцяў канкрэтнага чалавека (узрост, вага, пол), яго фізічнай актыўнасці і спосабу жыцця, індывідуальных смакавых пераваг і, нарэшце, стану яго здароўя. Менавіта таму значна больш эфектыўнай за дыеты будзе распрацоўка індывідуальнага рацыёнаў харчавання — то-бок праграм харчавання, складзеных «адрасна», найбольш падыходзячых канкрэтнаму чалавеку, што дазваляе без шкоды для здароўя дасягнуць жаданай вагі. Такую паслугу аказвае Навукова-даследчая лабараторыя функцыянальнага харчавання НПЦ па харчаванні. Гэта датычыцца як карэкцыі вагі, так і распрацоўкі дыеты пры наяўнасці хранічных захворванняў органаў і сістэм, пры якіх дыетатэрапія з'яўляецца састаўной часткай лячэння. Прыём вядуць урачы-дыетолагі. Дынамічны кантроль за вынікамі змены рацыёну харчавання ажыццяўляецца на падставе біяімпедансаметрыі — сучаснага высокадакладнага апаратнага метаду вызначэння складу цела чалавека, заснаванага на вымярэнні электрычнага супраціўлення тканак чалавечага цела. Метад дазваляе вывучыць абмен рэчываў, водна-солевы, тлушчавы абмены і разабрацца з тым, што ўплывае на прапорцыі і вагу цела чалавека. Ён адрозніваецца высокай дакладнасцю і надзейнасцю для аб'ектыўнай ацэнкі эфектыўнасці падбору дыеты, выбару спосабу і ўзроўню фізічнай нагрузкі, а таксама ацэнкі эфектыўнасці лячэння і яго ўплыву на стан пацыента.

***— Ці ёсць правілы харчавання, якія падыдуць усім?***

— Важна навучыцца слухаць свой арганізм, сачыць за адчуваннем пры пераменах у харчаванні. Гэта працяглы працэс, які закранае змену мыслення. Чалавек павінен і можа адчуваць эстэтычнае задавальненне ад выгляду, натуральнага смаку ежы, без фанатычнага падліку калорый. Правілы для ўсіх — якасная пітная вада ў дастатковай колькасці; абмежаванне ў рацыёне прадуктаў, якія не валодаюць фізіялагічнай карысцю (чыпсы, сасіскі, кетчупы, маянэзы, фаст-фуд). Раслінная і бялковая ежа як асноўны рацыён (кісламалочныя прадукты, тварог, сыры, рыба і морапрадукты, індычка, курыца, час ад часу — чырвонае мяса). Абавязковая прысутнасць у рацыёне грубых валокнаў і клятчаткі. Паўнавартасны сняданак. Норма аднаго прыёму ежы — 200—300 г. Сёння насельніцтва Беларусі пакутуе ад залішняга спажывання жывёльных тлушчаў, дэфіцыту поліненасычаных тлустых кіслот, паўнавартасных жывёльных бялкоў, харчовых валокнаў, мінеральных рэчываў, мікраэлементаў і вітамінаў. Мы маем патрэбу ў аздараўленні, у першую чаргу — праз правільнае харчаванне. І нарэшце, я параіла б адмовіцца ад любых навамодных дыет і прытрымлівацца выключна збалансаванага рацыёну. Толькі так можна скінуць лішнія кілаграмы без шкоды для здароўя.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк».

Наименование объекта продажи –

## КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ (ГАРАЖ)

**общей площадью 46,0 кв. м в г. Ганцевичи Брестской обл. по ул. Октябрьской, 8А.**

Начальная цена продажи – 2 976,00 руб. (две тысячи девятьсот семьдесят шесть руб. 00 коп.) с учетом НДС – 20 %.

Сумма задатка – 300,00 руб. (триста руб. 00 коп.).

**Открытый аукцион состоится 20.09.2022 в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал (9-й этаж).**

Заявление на участие принимается в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 16.09.2022 включительно по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409 (тел. (0162) 277518, (8029) 7939576).

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

По вопросам, связанным с организацией осмотра объекта продажи, обращаться по телефонам: (01646)23939 гор., 80291137265 моб. – Занько Денис Сергеевич.

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 16.09.2022 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

З начальнікам вытворчага ўчастка СВК «Прагрэс-Верцялішкі» Сяргеем Сакутам мы дамовіліся сустрэцца ў другой палове дня. Шукаць плантацыю не прыйшлося — яна раскінулася ўздоўж даволі ажыўленай трасы. А вось дабірацца да суразмоўніка прыйшлося амаль праз усё поле. Добра, што выпадкова наткнулася на юнака, які аказаўся яго сынам і прывёў мяне да бацькі на пагрузачны пункт. Дарэчы, хлопец і сам дапамагае на пагрузцы ягад.

Трэба сказаць, надвор'е ў той дзень выдалася надзвычай гарачае. Але для буякоў гэта — спрыяльны фактар. Вось толькі сёлета такіх дзён недастаткова для добрага ўраджаю, заўважае Сяргей Сакута. Ды і замаразкі начныя трымаліся амаль да 10 мая. У параўнанні з мінулым сезонам, збор ягад пачалі на два тыдні пазней. Сапраўды, на плантацыі яшчэ значная частка зялёных. Збор вядзецца ў некалькі этапаў. Напрыклад, цяпер ідзе другая хваля, праз тыдзень-другі пачнецца канчатковы збор.

— Сёлета ўраджай не такі, як іншыя гады, у тым ліку і леташні, — адзначае начальнік участка. — Гэта звязана як з надвор'ем, так і з амаладжваннем плантацыі. Восенню мы абрэзалі старыя галіны, адпаведна, і ягад на кусце менш. Але гэта праца на перспектыву, бо кустам трэба даць адпачыць. У наступным сезоне «запрацуюць» і маладыя галіны.

«Прагрэсаўскай» плантацыі — 15 гадоў. І гэта яшчэ даволі малады ўзрост, бо кусты могуць пладаносіць і да 100 гадоў. Ураджайнасць — кілаграм з куста. Пры добрым раскладзе можна атрымаць тры кілаграмы. Сёлета сітуацыя іншая — разлічваюць на больш сціплы ўраджай — 1,5-2 кілаграмы. Тым не менш, культура для гаспадаркі выгадная. Частка ягад ідзе на экспарт у Расійскую Федэрацыю. Забяспечваюцца і ўсе 10 фірменных крамаў прадпрыемства, у тым ліку павільёны на рынках.

— Ягады прадаём свежыя, не марозім. Яны добра захоўваюцца пры тэмпературы чатыры градусы ад сямі да 14 дзён. А некаторыя сарты і да месяца ляжаць. Рэалізацыя ідзе нядрэнна, сярэдняя цана — 12-13 рублёў за кілаграм. Яна на ўзроўні мінулага сезона. Увогуле такая цана трымаецца некалькі гадоў, — заўважае суразмоўнік.

Магчыма, гэта звязана з тым, што кожнага года прапаноў з кожным годам павялічваецца. Буякамі цяпер займаюцца як фермеры, так і сельгаскааператывы. Многія культывуюць кустарнікі на сваіх прысядзібных і дачных участках. Наватарам у дадзенай справе стала Брэсцкая вобласць, дзе больш за ўсё такіх плантацый. Менавіта адтуль, з Івацэвіцкага раёна, прывезла гродзенская гаспадарка і свае першыя саджанцы. Пачыналі з трох гектараў. Паступова давялі плошчы да 12. Налета мяркуюць павялічыць яшчэ на пяці гектараў. Гэта будуць ужо ўласныя саджанцы, якія, дарэчы можна набыць і на самой плантацыі за пяць-сем рублёў. Сорт — блюкроп.

— Попыт на саджанцы расце, і вельмі істотна, — кажа начальнік участка. — Цяпер амаль на кожным падворку хоць пара кусцікаў, але ёсць. У многіх і да тысячы даходзіць, па 100, 500 саджанцаў бяруць. Тут паўсюдна лёгкія землі, галоўнае — правільна стварыць яму для пасадкі, унесці кіслы торф, патрэбныя пілавінне, кара. Пакольні тут пяскі, у нас наладжаны кропельны паліў.

На зборы ягад працуе штодзень 50—70 чалавек. У асноўным — свае, тутэйшыя. Але на работу ахвотна бяруць і гараджан. У брыгадзе нямала студэнтаў. У сацыяльнай сетцы створана група, дзе можна даведацца аб прапанове і заявіць аб сваім жаданні папрацаваць. Для падвозу на палеткі гаспадарка выдзяляе аўтобус.

Пры добрым ураджаі можна зарабіць да 100 рублёў у дзень. Для гэтага трэба сабраць 120 кілаграмаў ягад. У асноўным збіраюць 60—80.

Работа ручная, хоць ёсць і спецыяльныя камбайны. Праўда, іх кошт дасягае паўмільёна долараў і разлічана такая тэхніка на вялікія плошчы — 200—300 гектараў. Таму гаспадарцы набываць такі камбайн асабліва нагоды няма.

Сваім вопытам падзялілася маладая зборшчыца Вікторыя. Заўважаю, што яна моцна загарэла. Прытым, што працуе толькі другі дзень. Гэта і зразумела — амаль сем гадзін на адкрытым сонцы. Аказалася, што Вікторыя прывычная да такой работы. Другі сезон яна бярэ водпуск, каб мець дадатковы заробак.

— Тут можна зарабіць, — кажа яна. — Усё ў тваіх руках — колькі збярэш, так і атрымаеш. За сезон можна і тысячу рублёў зарабіць. Я пакуль сабрала 80 кілаграмаў, летась і па 116—120 кілаграмаў збірала ў дзень. Есці ягады ніхто не забараняе, але падчас работы больш думаеш аб тым, каб больш сабраць.

На плантацыі працуе нямала студэнтаў. У іх ліку будучы медык Рыхард. Прыехаў на канікулы да бабулі і вырашыў крыху падзарабіць да стыпендыі. Кажа, што двухлітровае вядзерца набіраецца даволі хутка, падчас гутаркі студэнт якраз напоўніў 10-літровае вядро. Ён звяртае ўвагу на спрыяльны фон для работы — гоман птушак, лес і спакойную атмасферу. Кажа, што ніхто не крычыць, наадварот, многія жартуюць, а



кіраўнікі вытворчага працэсу добра ставяцца да зборшчыкаў. Рыхард мяркуе і далей працаваць на зборы ягад.

Знаёмлюся з іншымі прадстаўнікамі студэнцкага дэсанта. Арцемій вучыцца ў БНТУ, а родам з суседняга аграгарадка Абухава. Аб магчымасці падзарабіць расказалі знаёмыя. Тэмпы работы ў хлопца высокія. Кажа, што за дзень мяркуе набраць да ста кілаграмаў. Мэта — набыць новы ноўтбук. Тут яму дапамагаюць сястра Марыя — студэнтка Гродзенскага медуніверсітэта, бабуля, Марыя Афанасеўна. На плантацыю сямейная брыгада прыехала сваім транспартам.

— Я дзеля ўнукаў прыехала, яны малайцы, не лянуюцца, добра працуюць, многа збіраюць. Баюся толькі, каб унучка не абгарэла на сонцы, — непакоіцца бабуля.

І сапраўды, сонца даволі пякучае. «Такое надвор'е не кожны дзень, — зноў уступае ў гутарку Вікторыя. — З іншага боку, для буякоў патрэбнае менавіта сонца, інакш яны не будуць спець».

У мінулым сезоне з плантацыі сабралі каля 70 тон, але сёлета будзе крыху менш з-за амаладжвання кустоў, адзначае начальнік участка. Тым не менш, у гаспадарцы набылі пэўны вопыт у вырошчванні і ўпэўніліся, што гэтыя ягады — перспектыўная культура, таму і вырашылі значна павялічыць плошчы. У гаспадарцы таксама разглядаюць магчымасць культывацыі ягад гаджы. Іх развядзеннем займаецца суседняе сельгаспрадпрыемства. Праўда, перавага застаецца за праверанымі часам буякамі, якія прыйшліся даспадобы беларускім спажыўцам.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что в соответствии с решением наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» от 4 августа 2022 года, протокол № 18, на основании предложения правления ОАО «Белагропромбанк» 5 сентября 2022 года**

**ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ОЧНОЙ ФОРМЕ.**

Место нахождения общества и место проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

**Повестка дня**

1. О досрочном прекращении полномочий наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».
2. Об избрании членов наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».
3. Об утверждении состава счетной комиссии ОАО «Белагропромбанк».

Время начала проведения собрания – 15.00.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 5 августа 2022 года.

Лица, имеющие право на участие в общем собрании, могут ознакомиться с перечнем информации (документов) при подготовке к проведению собрания по адресу: г. Минск, пр-т Жукова, 3, следующим образом: при регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании, им предоставляются для ознакомления следующие документы:
- проекты решений собрания;
- сведения о кандидатах, выдвигаемых в наблюдательный совет ОАО «Белагропромбанк».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет проводиться по месту проведения собрания 5 сентября 2022 г. с 14.00 до 14.45 при предъявлении документов, подтверждающих их личность и полномочия.

Телефон для справок 8 (017) 229 64 10.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.*

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Столбцовский РКБО» Минская область, г. Столбцы, ул. Я Коласа, 28** |

**Предмет электронных торгов**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена с НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 909 | Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48113 | 110 000,00 |

**расположенные по адресу:** Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, ул. Социалистическая, 26, наименование – здание дома быта

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не **более 950,00 руб.**

**Дата и время начала торгов: 26.08.2022** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 26.08.2022** в 16.00

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с **06.08.2022 по 24.08.2022** с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by**

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ИП Фомина С.М. (Продавец)**

**Лот № 1:**

ВРЕМЕННАЯ ОТКРЫТАЯ АВТОСТОЯНКА С КОНТРОЛЬНО-ПРОПУСКНЫМ ПУНКТОМ, инв. № 500/С-32053, 3878,3 кв. м

Адрес: г. Минск, ул. Радиальная, 19.
Земельный участок 500000000001000336, 0,3899 га (Право аренды по 30.09.2043).
Начальная цена без НДС – 495 000,00 руб.
Задаток – 24 750,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 13.09.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **09.09.2022 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мирополье» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ АДМИНИСТРАТИВНО-ХОЗЯЙСТВЕННОГО**

***(составные части и принадлежности: цокольный этаж, крыльцо)***

**с инв. № 610/С-57979 общей площадью 439 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887403601000302 (право аренды по 02.02.2113) площадью 0,4633 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Житьково, ул. Новая, 15А.**

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0213 га; охранная зона линий электропередач напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0249 га; водоохранная зона водных объектов, пл. 0,4186 га; прибрежная полоса водных объектов, пл. 0,0447 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **12 217,75 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **1 221,00** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 80 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260016933 0000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 16.04.2020, 05.06.2020, 18.08.2020, 26.09.2020, 19.08.2021, 03.11.2021, 30.12.2021, 02.07.2022.

Аукцион состоится **22.08.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.08.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра (8044) 555-25-91.**

УНН 600134365

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 06 сентября 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белстройматериалы»**

| **Предмет торгов** |
|---|
| Изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-7114724 общей площадью 257,5 кв. м (наименование: помещение неустановленного назначения; назначение: помещение неустановленного назначения) |
| Местонахождение: г. Минск, ул. Бабушкина, 48-1 |
| Начальная цена: 44 064,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 4 400,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «Белстройматериалы», пр-т Партизанский, 99а, 220021, г. Минск, тел. (017) 342-71-92.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя – 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа на срок до 6 месяцев после заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **06 сентября 2022 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.08.2022 по 02.09.2022 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефонам: (017) 236-83-03, (029) 611-03-28.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 272-55-57, (029) 302-68-86 (ОАО «Белстройматериалы»).**

---

**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Брагинский КБО»** (УНН 400032430) 247632, Гомельская область, г. п. Брагин, ул. Советская, 31. Тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **23 августа 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

Капитальное строение, инв. № 343/С-95794,
**Гомельская обл., Брагинский р-н, Угловский с/с, д. Рудня Журавлево, 17. Общ. пл. – 83,4 кв. м, здание специализированное для бытового обслуживания населения.**
**Составные части и принадлежности: сарай, ограждение.**
**Кадастровый номер земельного участка 320387007101000019.**
**Начальная цена предмета торгов – 2 740,00 бел. руб. с НДС.**
**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 12.08.2022 г. по 17.00 22.08.2022 г. 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее рабочих 10 дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 23.07.2022 г.

---

**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Хойникский КБО»** (УНП 400056519) 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 28, тел.: +375 232 31-59-72, +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **23 августа 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

Капитальное строение с инв. № 343/С-95722,
**Гомельская обл., Хойникский р-н, Борисовщинский с/с, аг. Храпков, ул. Строительная, 46А, общ. пл. – 89 кв. м, здание специализированное для бытового обслуживания населения.**
**Кадастровый номер земельного участка 325480802101000076.**
**Начальная цена предмета торгов – 1 580,00 бел. руб. с НДС.**
**Шаг торгов – 5 %,**
**задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.**
**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 12.08.2022 г. по 17.00 22.08.2022 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» 23.07.2022 г.

---

**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Речицкое районное потребительское общество** (УНП 400037088) 247500, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2 в лице ликвидатора Беланова Руслана Николаевича, тел. +375 (29) 690-00-10.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **23 августа 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

Автомобиль ГАЗ 3302, АФХ 3302 «Любава»,
2009 г. в., рег. знак № АЕ 4202-3, инв. № Х1136, грузовой фургон.
Начальная цена предмета торгов – 550,00 бел. руб. без НДС.
Местонахождение – Гомельская обл., г. Речица, ул. Привокзальная, 2.
Телефон для ознакомления и осмотра: +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 12.08.2022 г. 09.00 по 22.08.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» 21.07.2022 г.

Год гістарычнай памяці

# ЗНАЙШЛІ СПАЧЫН НА БЕРАЗЕ ЛУЧОСЫ

## У Віцебскім раёне прайшла жалобная цырымонія перапахавання астанкаў 108 байцоў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў лютым-сакавіку 1944 года каля вёскі Навікі Шапечынскага сельсавета

**Сёння ў полі пад Навікамі, дзе адзіным напамінам аб жудасных вызваленчых баях 1944-га з'яўляюцца строгія гранітныя пліты, ціха. Свеціць сонца, калыша вецер галінкі беластволых бярозак... Калі б не бачыў яркапунсовыя труны і жоўты пясочак свежавыкапанай брацкай магілы, ніколі б не падумаў, што амаль 80 гадоў таму гэта зямля была заслана целамі нашых салдат.**

Тут у 1943 годзе немцы стварылі ўмацаваны апорны пункт: на заходнім беразе Лучосы пабудавалі бліндажы, дзоты, перакінулі небывалую для таго часу колькасць разнастайнай артылерыі. Нашым байцам паставілі нялёгкую задачу: блакіраваць нямецкія войскі з мэтай працягнення вызвалення Беларусі і ліквідаваць плацдарм. Баі за яго пачаліся 8 лютага. Змяняючы адзін аднаго, на вогненную амбразуру ішлі 26-я і 43-я гвардзейскія танкавыя брыгады; 215-я, 173-я, 371-я стралковыя дывізіі; а для 735-га самаходнаартылерыйскага палка, у складзе якога былі 19-гадовыя хлопчыкі — выпускнікі Растоўскага артылерыйскага вучылішча, бой у ноч на 13 лютага стаў апошнім... Сваю задачу байцы выканалі, заплаціўшы найвышэйшую цану — на навікоўскіх палях засталося звыш 27 тысяч салдат.

15 гадоў беларускія пошукавікі сумесна з расійскімі калегамі вяртаюць з небыцця імёны загінулых падчас Вялікай Айчыннай вайны. Чаму? У двух народаў — агульная Перамога, адны на ўсіх памяць і боль, абавязак перад героямі-вызваліцелямі. Нягледзячы на тое, што два разы на год на тэрыторыі раёна праходзіць Вахта Памяці, а сумеснымі намаганнямі беларускіх і расійскіх энтузіястаў ужо падняты і перапахаваны астанкі звыш тысячы савецкіх салдат, такой работы хопіць яшчэ на дзесяцігоддзі. Па выніках пошукавай экспедыцыі, якая праходзіла ў красавіку на тэрыторыі Шапечынскага сельсавета, намаганнямі Віцебскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Полымя», Маскоўскай грамадскай арганізацыі «Дабрачынны ваенна-гістарычны пошукавы клуб «Памяць і прымірэнне», грамадска-патрыятычнай арганізацыі «Заходні рубеж» былі знойдзены астанкі 108 байцоў Чырвонай Арміі. На жаль, усе яны засталіся безыменнымі. Знайшлі адзін медальён, але час узяў сваё — прачытаць спарахнелую запіску не атрымалася.



На воінскім мемарыяле ў Навіках сабраліся пошукавікі з Беларусі і Расіі, кіраўніцтва вобласці і раёна, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, 103-й Віцебскай асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады, 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна, які суправаджае кожную экспедыцыю, мясцовыя жыхары, каб з воінскімі ўшанаваннямі адправіць воінаў у апошні шлях.

«Вельмі важна, што абаронцы нашай Радзімы нават праз 78 гадоў будуць перапахаваны тут, у брацкай магіле, да якой змогуць прыйсці ўдзячныя нашчадкі, каб выказаць удзячнасць за гераізм і мір. Подзвіг савецкага народа неўміручы і неацэнны. Важным імпульсам у патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення з'яўляецца далучэнне моладзі да пошукавай дзейнасці. Так летась да маскоўскіх кадэтаў далучыліся навучэнцы Полацкага кадэцкага вучылішча», — адзначыў **старшыня дэпутацкага корпуса Віцебшчыны Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.**

**Старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў Віктар ДАРОЖКІН** расказаў, што ў раёне кожнае воінскае пахаванне даглядаюць не толькі мясцовыя жыхары, але і арганізацыі і ўстановы. За бягучы год ужо падняты астанкі 138 ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, якія загінулі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, дадзеная работа працягваецца сёння на тэрыторыі Заронаўскага сельсавета. Віктар Васілевіч падзякаваў пошукавікам за нялёгкую і адказную работу па ўвекавечанні байцоў і ўручыў падзякі.

**Кіраўнік клуба «Памяць і прымірэнне» Валерый ЗАГРЭКАЎ** расказаў, што ўдзел у Вахтах Памяці кадэтаў — невыпадковы. Адна справа — вучыць гісторыю па падручніках, іншая — дакрануцца да яе ў літаральным сэнсе. Летась да навучэнцаў кадэцкага класа Маскоўскай школы № 760 імя Марэсьева далучыліся іх аднагодкі з Полацкага кадэцкага вучылішча. Сёлета бывалым пошукавікам дапамагаюць школьнікі Полацкай школы № 1 і члены пошукавага атрада «Наступленне» Цэнтра грамадска-патрыятычнага выхавання моладзі Арэхава-Зуеўскай гарадской акругі Масквы «Спектр».

Хвілінай маўчання прысутныя ўшанавалі памяць загінулых. Благачынны 2-га Віцебскага раённага благачыння протаіерэй Уладзімір Пашкевіч здзейсніў памінальную літыю, на брацкую магілу ўсклалі вянкі і кветкі ўдзячныя нашчадкі, адсалютавалі зброевым залпам дэсантнікі, праводзячы ў апошні шлях 108 байцоў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

***Перш чым звярнуцца да прозы, Навум Гальпяровіч заявіў пра сябе як пра яркага, арыгінальнага паэта і выдаў не адзін вершаваны зборнік. Зварот да сумежнага жанру — з'ява ў літаратуры досыць распаўсюджаная, і асцярожныя крытыкі такую з'яву вельмі часта называюць «проза паэта». Але што датычыцца творчасці Навума Гальпяровіча, то ў ёй, мне здаецца, гэтыя два жанры досыць раўназначныя і самадастатковыя. У сваіх аповесцях і апавяданнях аўтар не злоўжывае больш характэрнымі для паэзіі прыёмамі — метафарамі, сімваламі, а як правіла, стаўку робіць на сюжэт. Проза яго празрыстая, як крынічная вада, але яна — для ўдумлівага чытача, які за гэтай празрыстасцю бачыць глыбіню.***

**Алесь БАДАК.**

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ**

# ДЗВЕ МАМЫ

Гэтага сівога паўнаватага доктара ведалі не толькі ў родным горадзе. Пра яго залатыя рукі хірурга-траўматолага хадзілі легенды. Ён ставіў на ногі, здавалася б, безнадзейных інвалідаў.

Усмешлівы, аматар сяброўскіх кампаній, ён уражваў мяне сваім аптымізмам, прагай да жыцця.

«Во шчаслівчык, — думаў я, — бываюць жа такія бясклапотныя людзі!»

Але раптам Восіпавіч неяк знік з поля зроку. У невялікім горадзе, дзе каго-каго, а дактароў ведаюць практычна ўсе, не заўважыць гэта было немагчыма.

Асабліва ўстрывожыліся тыя, хто запісваўся ў чаргу на планавыя аперацыі.

«Нешта Бярозкін не прымае, здарылася, можа, што?»

І сапраўды здарылася. Напаткала Восіпавіча жахлівая хвароба, і праз паўгода труна з яго целам стаяла ў фае гарадскога Дома культуры.

Людзей на пахаванні было шмат. Я звярнуў увагу, што акрамя гараджан было нямала прыезджых, па выглядзе вяскоўцаў. І каля труны разам з роднымі сядзела пажылая незнаёмая жанчына ў жалобнай хусцы.

— З Глыбокага, — сказала побач са мной жанчына, — бачыце, ад другой маткі прыехалі.

«Як гэта, ад другой маткі, — падумаў я, — маці ж заўсёды адна».

Яшчэ больш здзівіла, што адпяванне вёў ксёндз.

Здаецца ж, Восіпавіч каталіком не быў, ва ўсякім разе, ніхто за ім такога не заўважаў.

Прамоўцы гаварылі цёплыя словы, адзначалі, што Восіпавіча любілі, цанілі яго прафесійнае майстэрства і спагадлівасць, яго грамадскія справы.

А я ўважліва глядзеў на ўдаву, сыноў і на вясковую пажылую жанчыну, якая прыехала, як казалі, «ад другой маткі»...

І за жалобным сталом яна сядзела сярод радні. Калі ёй далі слова, яна змагла толькі вымавіць «Пухам зямля нашаму Янэку!»

«Якому Янэку?» — зноў здзівіўся я, бо Восіпавіча ж звалі, здаецца, Ісак...

Калі ўсе разыходзіліся, я падышоў да знаёмай журналісткі і запытаў:

— Не ведаеш, што за жанчына з Глыбокага была, і чаму яна назвала Восіпавіча Янэкам?

— Ну, гэта цэлая гісторыя! Восіпавіча ж немаўлём з гета ў вайну забрала іншая жанчына. Я падрабязнасцяў не ведаю, але казалі, што рос ён у беларускай сялянскай сям'і.

Гісторыя мяне зацікавіла, і я скарыстаўся магчымасцю сустрэцца з сынам Восіпавіча, таксама доктарам, і запытацца пра бацьку.

— А вы прыходзьце да нас увечары, пагаворым, — сказаў ён. — Расказаць ёсць пра што.

Ва ўтульнай кватэры Бярозкіна-малодшага быў накрыты стол. Мяне чакалі яго жонка, вядомы ў горадзе тэрапеўт, і дзве дачкі, малодшая з якіх сваім выглядам нагадвала малое дзяўчо са знаёмай казкі сваімі светлымі валасамі, заплеценымі ў косы, і яскравай блакітнасцю вачэй.

— Дык вось, з чаго пачаць? Напэўна, з бабы Мані, — сказаў пасля першай чаркі Якаў. — Гэта пра другое нараджэнне таты.

Так мне адкрылася гісторыя Бярозкіна пра яго другое нараджэнне і праўда пра дзвюх яго маці.

У адным з мястэчак, што на Глыбоччыне, да вайны ледзь не палову насельніцтва складалі яўрэі. У тым ліку і вялікая сям'я аптэкара Бярозкіна.

Калі прыйшлі немцы, усіх яўрэяў сталі зганяць у гета. А ў жонкі аднаго з сыноў аптэкара, які быў на фронце, толькі што нарадзілася дзіця. Хлопчыку не было і двух месяцаў.

Ноччу ў хату мясцовага каваля Васіля Чубрыка пастукалася суседка. У яе ў руках быў спавіты хлопчык.

— Ратуйце, суседзі! Вось фамільны пярсцёнак залаты, вось завушніцы! Захавайце толькі з сябе дзіця, прашу, бо мы ж усе загінем.

Васіль збялеў. Гэта ж немцы калі дазнаюцца, уся сям'я прападзе.

— Не магу, даражэнькая, у саміх дзеці малыя, уцякай у лес, пакуль ноч, а мы нікому не скажам.

— А я вазьму, — раптам выскачыла з чыстай хаты васямнаццацігадовая Марыя, — паеду ў Глыбокае да цёткі, скажу, нагуляла. Шкада ж малога!

— Ты што, такую ганьбу на сябе ўзяць! — залямантавала жонка Васіля Рая. — Што людзі скажуць?

Няпрошаная госця ўся дрыжала, з вачэй ліліся слёзы.

— Досыць, — закамандаваў Васіль, — а ты, Манька, раз так, збірайся хуценька, пакуль раніца не заспела. Да бальшака дойдзеш пешкі, а там нехта падбярэ. А рэчы я заўтра да Гэлі падвязу.

Так маленькі Ізя стаў для ўсіх нагуляным Марыяй Чубрык сынам.

Хлопчыка хрысцілі ў Глыбоцкім касцёле. Ксёндз паспачуваў маладой жанчыне. Сына назвалі Янэкам.

А суседзі скоса паглядалі на Гэліну пляменніцу, — нагуляла недзе сыночка, сорам які, а яшчэ каталічка!

І толькі Богу было вядома, як няпроста было васямнаццацігадовай дзяўчыне гадаваць чужое дзіця, да якога яна з часам прывязалася, як да свайго.

Толькі галілі малога заўсёды «пад качан», — каб не відаць было кучаравых чарнявых валасоў.

Янэк рос ціхім, спакойным хлопчыкам, часта смяяўся, добра еў, хоць відавочна не хапала матчынага малака.

Бацька Марыі з жонкай ад граху падалей з'ехалі ў Шаркаўшчыну, баючыся, раптам суседзі прагаворацца, што Марыя ніякага сына не нараджала.

Скончылася вайна. А сапраўдная маці Янэка засталася жывой, ёй удалося тады ўцячы з гета, перайсці лінію фронту і трапіць медсястрой у вайсковы шпіталь, прайсці з ім усю вайну.

Яна з мужам, які таксама вярнуўся з фронту, апынулася пасля Перамогі ў Полацку. Кожны тыдзень яна адпраўлялася на Глыбоччыну шукаць сына.

І вось нарэшце ў Глыбоцкім касцёле ёй расказалі пра Марыю і Янэка.

Хлопчык, якому было ўжо пяць гадоў, ніяк не мог зразумець, чаму мама яго хоча аддаць чужой цётцы. Ён плакаў і чапляўся за Марыіну спадніцу.

Плакалі і жанчыны...

— Я і цяпер плачу, — заўважыла жонка Бярозкіна Святлана, — хоць і не раз чула гэты расповед.

— Так у бацькі стала дзве маці, а ў нас дабавілася глыбоцкая радня, — сказаў гаспадар кватэры. — Кожнае свята мы з самага дзяцінства ездзілі ў Глыбокае да бабы Мані, прывозілі падарункі. Бацька да сваіх апошніх дзён зваў яе мамай.

— І цяпер, — дадала Святлана, — мы па-ранейшаму сябруем, трымаемся разам.

— А хто была тая жанчына на пахаванні?

— Гэта дачка Марыі. Марыя ўсё ж выйшла замуж, нарадзіла дачку, але свайго Янэка любіла як роднага сына, ганарылася яго поспехамі. Нядаўна яе не стала.

— Не стала і бацькавай роднай маці, — дадаў Якаў, — але і для бацькі, і для нас памяць пра іх была аднолькавай, помнікі мы ставілі на абедзве магілы.

— І вянкі былі з надпісам «ад сына і яго сям'і», — сказала Святлана.

— Абедзвюм, — скончыў Якаў.

Вярнуўшыся дадому, я доўга не мог заснуць. У маіх вачах стаялі Янэк-Ізя і яго дзве маці, якім ён быў абавязаны сваім жыццём.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Большасць хвароб грушы мае грыбковую прыроду. Грыбы любяць вільгаць і цеплыню. Каб перашкодзіць ім адчуваць сябе добра на грушы, не саджайце дрэва ў тых месцах саду, якія дрэнна праветрываюцца.**

# Хваробы грушы

## Парша

Прычына захворвання — грыбок Venturia pirina. Груша не можа заразіцца ад яблыні, бо ў іх розныя віды ўзбуджальніка.



Грыбок любіць высокую вільготнасць і дрэнную вентыляцыю ўчастка вятрамі, а таксама слабыя расліны (расколіны, высільванне пры багатым плоданашэнні).

Распаўсюджванне хваробы прыпадае на перыяд цвіцення дрэў. Споры грыбка выходзяць з сумак і пры спрыяльных умовах распаўсюджваюцца на далёкія адлегласці.

Плады, пашкоджаныя паршой, пакрываюцца карычневымі акруглымі плямамі. Яны могуць злівацца на фрукце і станавіцца адным вялікім некрозам. Лупіна ў месцах пашкоджання можа трэскацца. Пры раннім паражэнні дрэва плод можа вырасці дробным і мець расколіны.

## Пладовая гніль, або маніліёз

Гэтае захворванне шкодзіць не толькі грушы, а і вельмі многім іншым пладовым і костачкавым дрэвам у садзе. Маніліёз здольны нанесці значны ўрон ураджайнасці. Асабліва ён небяспечны ў перыяд плоданашэння. Але нават пасля таго, як вы знялі ўраджай, хвароба нікуды не дзяваецца, а застаецца на плодзе, дзе працягвае сваё згубнае дзеянне.

Выяўляецца ў дзвюх формах:

**пладовая гніль.** Узбуджальнікам з'яўляецца шкодны грыб. Гэта вельмі небяспечны вораг, бо пасля яго плады становяцца цалкам непрыдатнымі да ўжывання. Першай праявай будзе ўтварэнне бурай плямы на грушы, якая хутка разрастаецца па ўсім плодзе. Смакавыя якасці цалкам губляюцца разам з таварным выглядам. На гнілі з'яўляюцца светлыя плямы — гэта споры калоній грыба. Яны лёгка пераносяцца з дажджом ці ветрам, таксама пераносчыкамі могуць быць насякомыя. Імклівае развіццё робіць маніліёз небяспечным ворагам для ўсяго саду, інкубацыйны перыяд доўжыцца ўсяго некалькі дзён, а ўжо праз тыдзень споры гатовыя адправіцца на іншае дрэва.



Пранікаюць яны праз невялікія трэшчынкі і пашкоджанні. Аптымальнае надвор'е — тэмпература ад +16 да +30° С і высокая вільготнасць паветра. Калі занадта суха, горача, холадна, споры не пераносяцца, а становяцца сінявата-тага колеру і муміфікуюцца. Такі працэс часцей за ўсё адбываецца на плодзе падчас захоўвання. Таму важна пазбаўляцца ад іх, асабліва калі яны апалі з дрэва. Грыб можа захавацца ў іх да вясны, дачакацца прыдатных умоў і пачаць заражаць здаровыя расліны.

**Маніліяльны апёк.** У гэтым выпадку пашкоджанымі застаюцца суквецці і кветкі, пладовыя галінкі. Выклікае гэты стан таксама грыб, які захоўваецца ў міцэліі, на пашкоджаных галінах, а вясной пачынае сваю актыўную дзейнасць. Тэмпература абуджэння — прыкладна 14° С, таксама неабходны умовай для распаўсюджвання будзе павышаная вільготнасць у выглядзе дажджоў, туманаў.

**Прафілактыка**

Грыбок можа перазімаваць разам з апалым лісцем, таму ключавы момант у прафілактыцы — своечасовая прыборка садовага ўчастка.

Перыядычна трэба прараджваць крону і прыбіраць лішнія галіны. У перыяд плоданашэння — адразу прыбіраць плады, якія апалі. Таксама неабходна зрываць з галінак хворыя, муміфікаваныя плады.

Апрацоўваць заражаныя расліны можна з дапамогай фунгіцыдаў. Добра сябе зарэкамендавалі наступныя: «Хорус», «Стробі», «Бардоская вадкасць», «Абіга-Пік».

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.40 | 20.48 | 15.08 |
| Віцебск — | 5.25 | 20.42 | 15.17 |
| Магілёў — | 5.30 | 20.38 | 15.08 |
| Гомель — | 5.32 | 20.29 | 14.57 |
| Гродна — | 5.56 | 21.02 | 15.06 |
| Брэст — | 6.02 | 20.58 | 14.56 |

## Месяц

*Першая квадра 5 жніўня. Месяц у сузор'і* *Вадаліва.*

## Імяніны

***Пр.*** *Серафімы, Астапа, Канстанціна, Кузьмы, Міхала, Серафіма.*
***К.*** *Зузаны, Клары, Луізы, Аляксандра, Уладзіміра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**11 ЖНІЎНЯ**

У краіне

**1681** год — нарадзіўся Арсеній, манах Куцеінскага Богаяўленскага манастыра (пад Оршай). Быў майстрам «беларускай рэзі» — аб'ёмнай карункавай разьбы з раслінным арнаментам, у які ўпляталіся выявы чалавека, птушак і звяроў. Гэтай разьбой беларускія майстры ўпрыгожвалі палацы і інтэр'еры культавых будынкаў Масквы і Падмаскоўя. Пасля 1655 г. працаваў у майстэрні Іверскага манастыра на Валдаі, у Васкрасенскім саборы Новаіерусалімскага манастыра ў г. Істра. Затым пераехаў у Маскву, дзе кіраваў арцелямі, якія афармлялі Каломенскі палац цара Аляксея Міхайлавіча. Да самай смерці ўзначальваў майстэрню разных і сталярных спраў у Зброевай палаце Крамля, дзе працавала больш за 20 беларускіх майстроў. Мастацтва Арсенія яшчэ пры жыцці атрымала шырокае прызнанне і спрыяла развіццю рускай мастацкай разьбы.



**1900** год — нарадзіўся Міхаіл Яўхімавіч Крошнер, беларускі савецкі кампазітар, заслужаны артыст БССР. Стварыў першы беларускі нацыянальны балет «Салавей» паводле аповесці Змітрака Бядулі.

***У гэты дзень таго ж года*** заснавана Гродзенскае таварыства сельскай гаспадаркі (існавала да 1915 года), мела сельскагаспадарчае вучылішча, лабараторыю, батанічны сад.

**1907** год — нарадзіўся (г. Мінск) Аляксей Аляксандравіч Бараноўскі, акцёр, заслужаны артыст БССР. З 1929 года — у Беларускім дзяржаўным перасоўным тэатры пад кіраўніцтвам У. Галубка, з 1933-га — у Беларускім ТРаМе, з 1937 года — у Беларускім тэатры імя Я. Купалы. Камедыйны і характарны акцёр, майстар эпізоду.

**1912** год — адкрыта Слуцкая жаночая гімназія. Мела сем асноўных і падрыхтоўчы клас. Утрымлівалася за кошт збораў за навучанне (50-80 рублёў штогод з вучаніцы) і дапамогі з казны. Выкладаліся: Закон Божы, руская, нямецкая і французская мовы, асновы педагогікі, прыродазнаўства, геаграфія, рукадзелле, матэматыка, чыстапісанне, гісторыя, фізіка, спевы, маляванне, гімнастыка. Гімназія была зачынена ў 1918 годзе.

**1952** год — нарадзіўся (в. Маяк Слуцкага раёна) Мікалай Аляксеевіч Нямковіч, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук. Аўтар навуковых прац па даследаванні і распрацоўцы лазераў на фарбавальніках з электрахімічным кіраваннем частатой генерыруемага святла.

У свеце

**1795** год — нарадзіўся Іван Спаскі, рускі ўрач, дамашні доктар сям'і А. С. Пушкіна, аўтар запісак аб апошніх днях жыцця паэта.

**1906** год — француз Эжэн Агюстэн Лост запатэнтаваў тэхніку запісу гуку да кінафільма.

**1921** год — апублікавана распараджэнне Саўнаркама аб правядзенні ў жыццё новай эканамічнай палітыкі (нэп).

**1949** год — кіраўніцтва СССР аб'явіла аб тым, што перастае лічыць Югаславію саюзнікам.

**1947** год — у «Праўдзе» быў апублікаваны артыкул першага намесніка начальніка ўпраўлення прапаганды і агітацыі ЦК ВКП(б) Д. Шапілава «Савецкі патрыятызм», які паслужыў пачаткам кампаніі па абвінавачанні дзеячаў культуры ў касмапалітызме.

Так гаварыў...

**ЭРЫХ МАРЫЯ РЭМАРК:**

*«Самая цяжкая хвароба на свеце — гэта звычка думаць. Яна невылечная».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— А што вы робіце сёння вечарам? Вы толькі нічога дрэннага не падумайце, ну а калі раптам падумаеце, то... як вам ідэя?**

**— Добры дзень, я прыйшоў на сумоўе!**
**— Цудоўна, у вас ёсць вопыт?**
**— Так, гэта маё дваццатае сумоўе!**

— У мяне за плячыма бутэлька каньяку. Калі адгадаеш, у якой руцэ, — разап'ём, калі не адгадаеш — разаб'ём.
— У правай?
— Думай, Міхась, думай!

— Я зламаў нагу ў двух месцах.
— Вы запомнілі гэтыя месцы?
— Так.
— Больш туды не хадзіце!



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1851.
Нумар падпісаны ў 19.30 10 жніўня 2022 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12